ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 100 (2153)
13 снежня АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПАМЯЦІ АЎТАРА НЯВЯНУЧАГА «ВЯНКА»

Ён пражыў толькі дваццаць пяць гадоў і меў шчасце пабачыць пры жыцці толькі адзіную сваю кніжку вершаў «Вянок». Але імя яго навечна засталося ў сэрцы нашага народа, а зробленае ім увайшло залатой старонкай у гісторыю нашай літаратуры. Жыццё яго і творчасць—узор самаахвярнага служэння свайму народу і сваёй Бацькаўшчыне. І вечна будуць памятаць светлае імя паэта яго шчаслівыя нашчадкі. І вечна будзе свяціць яго непагасная зорка на небасхіле нашай паэзіі.

Сямідзесяціпяцігоддзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча шырока адзначалася ва ўсіх кутках яго васільковай Беларусі. У клубах і палацах культуры, у бібліятэках і чытальных залах, у школах і тэхнікумах былі наладжаны выстаўкі, прысвечаныя юбілею, адбыліся літаратурныя вечары і чытанні.

9 снежня, у дзень нараджэння паэта, вялікі ўрачысты вечар адбыўся ў актавай зале гуманітарнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Вечар быў арганізаваны Саюзам пісьменнікаў БССР, Міністэрствам культуры рэспублікі, Саюзам кампазітараў БССР, Беларускім тэатральным аб'яднаннем і універсітэтам. Залу запоўнілі пісьменнікі, дзеячы культуры і мастацтва рэспублікі, студэнты.

Уступным словам вечар адкрыў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк. Ён узнёсла і горача гаварыў аб непераўзыдзеным і бессмяротным укладзе ў беларускую літаратуру і культуру, які зрабіў Максім Багдановіч. З дакладам аб жыццёвым і творчым шляху паэта выступіў Алег Лойка. Свой даклад ён закончыў словамі:

— Я не веру, што Максіма Багдановіча няма сярод нас, што ён памёр. Ён жыве ў сэрцы кожнага з нас, у сэрцы нашага народа.

З успамінамі пра Максіма Багдановіча выступілі акадэмік АН БССР Ц. Годнеў, які разам з паэтам вучыўся ў Яраслаўскай гімназіі, і стрыечная сястра паэта А. Валасовіч-Гразнова. Вершы, прысвечаныя аўтару нявянучага «Вянка», прачыталі Максім Лужанін, Ціл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Піліп Пестрак, Уладзімір Караткевіч.

У заключэнне вечара адбыўся канцэрт, у якім гучалі песні на словы М. Багдановіча.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

12 снежня 1966 года ў Крамлі адкрыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

На парадку дня Пленума:

1. Аб міжнароднай палітыцы СССР і барацьбе КПСС за згуртаванасць камуністычнага руху.

2. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1967 год.

3. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1967 год.

З дакладам па першаму пытанню парадку дня Пленума выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.

Пленум працягвае сваю работу.

КОЛАСАЎЦЫ СВЯТКУЮЦЬ

Вялікае свята беларускага мастацтва адбылося ў Віцебску 11 снежня. У Беларускі дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа прыйшлі сотні людзей, прадстаўнікі заводаў, калгасаў, грамадскіх арганізацый. Прыйшлі, каб ушанаваць калектыў тэатра ў сувязі з 40-годдзем творчага шляху. Прыехала многа гасцей — вядомыя дзеячы мастацтва Беларусі і братняй Расіі.

12 гадзін дня. Адкрываецца заслона. Зала стоячы вітае юбіляраў. Увесь творчы склад тэатра ў прэзідыуме. У першым радзе — ветэраны, чые імёны шырока вядомы ўсёй краіне: народны артыст СССР А. Ільінскі, народны артыст БССР Ц. Сяргейчык, народны артыст БССР М. Звездачотаў, заслужаная артыстка БССР А. Лагоўская і іншыя.

Урачысты сход адкрывае сакратар Віцебскага абкома партыі М. Пахомаў. З дакладам выступае дырэктар тэатра Г. Асвяцінскі.

Цёпла сустракаюць прысутныя прывітанне Віцебскага абкома партыі і выканкома абласнога Савета дэпутатаў працоўных, якое зачытвае М. Пахомаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР сакратар Віцебскага абкома партыі У. Труноў зачытвае Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб узнагароджанні Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР групы работнікаў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, а таксама Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб прысваенні ганаровых званняў работнікам тэатра і ўручае граматы Вярхоўнага Савета БССР, а таксама ганаровыя граматы абкома партыі і аблвыканкома.

На трыбуне—намеснік міністра культуры БССР Ю. Міхневіч. Ён віншуе са святам калектыў аднаго з вядучых нацыянальных тэатраў рэспублікі, зачытвае загад міністра культуры БССР аб узнагароджанні 25 работнікаў тэатра граматамі міністэрства.

Ад імя прэзідыума Беларускага тэатральнага аб'яднання і ўсёй тэатральнай грамадскасці рэспублікі тэатр вітае народная артыстка СССР Л. Александроўская.

Горача, па-сяброўску коласаўцаў віншуюць купалаўцы і перадаюць у падарунак юбілярам вялікі фотаздымак трупы тэатра імя Якуба Коласа, зроблены ў год нараджэння тэатра.

Старшыня калгаса «Шлях перамогі» Сенненскага раёна А. Карась уручае юбілярам ад імя гаспадароў калгаснай зямлі каравай хлеба, абвіты вянком з лёну-даўгунца.

Ад імя пісьменнікаў Беларусі выступіў член прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Н. Пашкевіч.

Коласаўцаў віталі таксама рабочы завода імя Кірава Г. Анціпаў, доктар мастацтвазнаўства Ул. Няфёд, сакратар Віцебскага абкома камсамола Г. Анціпаў, намеснік старшыні Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР У. Іваноўскі.

Юбіляраў прыйшлі віншаваць юныя ленінцы. Яны прымаюць у ганаровыя піянеры ветэранаў тэатра, пад бурныя воплескі павязваюць ім гальштукі.

Са словамі глыбокай удзячнасці звярнуўся да прысутных народны артыст СССР А. Ільінскі. Ад імя калектыву ён падзякаваў Камуністычнай партыі і ўраду за высокія ўзнагароды.

— Дазвольце падзякаваць вам, дарагія таварышы,—сказаў ветэран тэатра,—за цёплыя словы, якія мы сёння чулі, і запэўніць, што калектыў нашага тэатра аддасць усе свае здольнасці на тое, каб быць дастойным памочнікам партыі ў пабудове камуністычнага грамадства.

Урачысты сход закончаны. Пасля сходу коласаўцы паказалі прэм'еру спектакля «Бацькаўшчына» па п'есе К. Чорнага.

На здымку — сцэна са спектакля «Бацькаўшчына», які паставіў народны артыст БССР Ф. Шмакаў і ў якім заняты ўвесь калектыў тэатра.

У ролях (злева направа): Леапольда Гушкі — народны артыст БССР А. Шэлег, яго жонкі — заслужаная артыстка БССР З. Канапелька, Марылькі — артыстка Т. Шашкіна.

Фота С. КОХАНА.

КРОК ФЕСТЫВАЛЮ

ПАСПЯШАЛІСЯ

Раённы фестываль самадзейнага мастацтва, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, першымі ў Мінскай вобласці правялі дзяржынцы.

За час падрыхтоўкі да фестывалю ў самадзейнасць прыйшлі новыя людзі, новыя калектывы. Гэта, напрыклад, ансамбль цымбалістаў з вёскі Дзягільна, у якім іграюць маці і дачка Боханы — Юзэфа і Ядвіга, Міхал Акаловіч, Міхал Мірон, усяго адзінаццаць чалавек. У калектыве, акрамя цымбалаў, гучыць і рэдкі цяпер народны інструмент карынка. Гэта і аркестр баяністаў, створаны ў музычнай школе, і лялечны тэатр, і драматычны калектыў раённага Дома культуры, і ансамбль гарманістаў Негарэльскага Дома культуры. Аднавіў сваю работу хор раённай бальніцы...

У глядзельнай зале раённага Дома культуры паўнютка народу. Адзін за адным выступаюць танцоры, спевакі, музыканты, чытальнікі. Арганізатары канцэрта імкнуліся як мага паўней прадставіць усе жанры мастацтва, усё лепшае, вартае ўвагі.

Але не ўсё задуманае ўдалося ім ажыццявіць. У раёне 25 клубаў, і толькі тры з іх — Навасёлкаўскі сельскі клуб, Негарэльскі і раённы дамы культуры — удзельнічалі ў справаздачным канцэрце. Не з'явіліся на агляд выканаўцы частушак з Путчынскага сельскага клуба, ансамбль цымбалістаў вёскі Дзягільна, вакальная група калгаса імя Фалько. Таму па некалькі разоў выступалі адны і тыя ж салісты, дуэты і нават калектывы.

Многа часу заняло ў канцэрце выступленне вучняў, хаця вядома, што хутка адбудзецца раённы агляд самадзейнасці школьнікаў.

Бедна былі прадстаўлены ў справаздачным канцэрце сельскія калектывы. Цяжка ўявіць раённы агляд без калгаснага хору, але менавіта такое здарылася ў Дзяржынску. Тлумачаць гэта ў аддзеле культуры адсутнасцю спецыялістаў-харавікоў. Але іх небагата і ў іншых раёнах рэспублікі, тым не менш там ёсць народныя хоры, калгасныя капэлы.

Не бяруся сцвярджаць, што ў раёне недаацэньваюць культуру. Наадварот, факты гавораць пра іншае — аб добрых клопатах мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, кіраўнікоў гаспадарак пра культасветустановы. Клубы, бібліятэкі падрыхтаваліся да зімы, яны адрамантаваны, забяспечаны палівам. Многія старшыні калгасаў усур'ёз узяліся за будаўніцтва клубаў. Сёлета, напрыклад, у раёне пабудавана шэсць клубаў.

Ёсць у раёне эканамічна моцныя калгасы — імя Дзяржынскага, імя Фалько, імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны маюць усе магчымасці стварыць у сваіх гаспадарках самадзейныя калектывы — хоры, танцавальныя ансамблі, драматычныя гурткі, аркестры народных інструментаў. І яны ёсць у гэтых калгасах, але ўзровень іх майстэрства настолькі прымітыўны, што ніводзін з іх нельга было рэкамендаваць на раённы фестываль.

— Няма кіраўнікоў, — гавораць у калгасах.

Даўняя, балючая праблема! Балючая не толькі для Дзяржыншчыны...

А людзей здольных у раёне многа. Трэба вучыць іх, дапамагаць удасканальваць свае здольнасці, з іх расціць кіраўнікоў самадзейных калектываў. На раённым фестывалі выявіліся, напрыклад, добрае сапрана ў салістцы Людмілы Чыжэўскай, прыгожы альт у Марыі Майсюк. Хораша спявалі Аляксандр Нядзелька, Георгій Клімук, Людміла Рудэнка і Надзея Валахановіч.

Упрыгожыла фестывальны канцэрт выступленне хору работнікаў раённай бальніцы. У ім спявае пяцьдзесят урачоў і медыцынскіх сясцёр. Прыемна было слухаць, як людзі паважанага ўзросту — заслужаны ўрач рэспублікі Т. Бяляева, хірург У. Гладкі, урачы У. Мальчэўскі, І. Коцік, Э. Якімовіч—разам з маладымі медыкамі Л. Хаменка, Э. Шэвелевай спявалі песні аб Леніне, «Квітней, Палескі край».

На фестывалі выступілі яшчэ два хоры — філіяла № 2 швейнай фабрыкі імя Крупскай і механічнага завода. Пры беражлівым стаўленні, сістэматычнай дапамозе і гэтыя калектывы здольны дасягнуць значна большага, чым паказалі сёння.

У рэспубліцы праходзяць мясцовыя агляды мастацкай самадзейнасці, сям-там трымаюць творчыя справаздачы артысты-аматары на раённых фестывалях. Сумны вынік агляду ў Дзяржынску павінен нейкім чынам насцярожыць і папярэдзіць усіх, хто адказвае за падрыхтоўку і правядзенне першага туру фестывалю.

Дзяржынцы паспяшаліся праводзіць раённы фестываль самадзейнага мастацтва. Фактычна гэта была першая рабочая рэпетыцыя справаздачнага канцэрта.

Я. ДАНСКАЯ.

ВЕЧАР БЫЎ АСАБЛІВЫ...

Гэты вечар Падлескага народнага хору Ляхавіцкага раёна быў асаблівы—сюды прыехалі члены рэспубліканскага аргкамітэта па правядзенню Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.

Зала Дома культуры калгаса імя Леніна перапоўнена. Сюды прыйшлі хлебаробы і з суседніх калгасаў—«Беларусь» і «40 год Кастрычніка».

Адкрывае вечар старшыня сельсавета Фёдар Карповіч. Ён гаворыць аб гаспадарчых і культурных дасягненнях калгасаў, вітае гасцей. Пасля яго выступае старшыня Беларускага рэспубліканскага аргкамітэта па правядзенню фестывалю намеснік старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў. Ён вітае ўдзельнікаў свята народнага мастацтва, жадае ім поспехаў.

І вось пачынаецца канцэрт. На сцэне—Падлескі народны хор.

Гучыць шырокая мелодыя «Прывітальнай». Пад гучныя апладысменты хор выконвае затым песні «Між нас жыве Ленін», «Ганна замуж паляцела», «Колас, ты мой колас», «Ой ты, край любімы» і іншыя.

Любяць у Падлессі спяваць. Спяваюць усюды: і ў полі, і дома, і ў клубе. Песня дапамагае жыць. І недарэмна падлескія спевакі славяцца на ўсю Брэсцкую вобласць. Тут склаліся багатыя песенныя традыцыі. Народны хор існуе ўжо больш чым 27 гадоў. Яго заснавальнікам і першым кіраўніком быў Г. І. Цітовіч.

Пры былой панскай Польшчы ў Падлессі спявалі рэвалюцыйныя і падпольныя песні. Не падабалася гэта панам, разганялі яны спевакоў. Калі прыйшла Савецкая ўлада, заспявалі па-новаму сяляне.

Народны хор карыстаецца вялікім поспехам. Яго калектыў тройчы выступаў у Маскве, шмат разоў удзельнічаў у абласных і рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці.

У Падлессі стала правілам: лепшы ў песні—лепшы і ў працы. Актыўная ўдзельніца народнага хору Валянціна Жук старанна працуе даяркай, нядаўна яе ўзнагародзілі ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. З часу заснавання хору спявае бухгалтар калгаса Герасім Праневіч. Хлебаробы сельгасарцелі імя Леніна выбралі яго намеснікам старшыні калгаса па культурна-масавай рабоце. Яшчэ ў маладосці, гадоў дваццаць назад, падружыліся з песняй фуражыр Уладзімір Смаршчок і яго жонка Лідзія. Людзі яны пажылыя, дзеці школу канчаюць, а яны акуратна «ходзяць у хор».

Добра на вечары выступіў і хор калгаса «Беларусь». А шафёр Павел Грамак прачытаў свой верш «Мой калгас».

З выпадку адкрыцця фестывалю ў клубе была арганізавана выстаўка твораў прыкладнога мастацтва. Народны ўмелец Л. Войтуль выразаў з дрэва цікавыя партрэты Янкі Купалы і Льва Талстога. С. Смаршчок вышыла партрэт Уладзіміра Ільіча Леніна.

На выстаўцы былі таксама прадстаўлены посцілкі, ручнікі, сурвэткі, прыгожыя вышыўкі. Між іншым, усе ўдзельнікі хору апрануты ў нацыянальныя касцюмы, якія прыгожа афармілі і расшылі мясцовыя ўмельцы...

ПЕСНІ, МУЗЫКА, ВЕРШЫ



У раёнах і гарадах Магілёўшчыны адбыліся конкурсы індывідуальных выканаўцаў. Конкурсы гэтыя ўваходзяць у праграму мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва.

Каля 300 лепшых спевакоў, танцораў, музыкантаў, чытальнікаў — пераможцаў мясцовых і раённых конкурсаў — прыехалі ў Магілёў, каб прадэманстраваць сваё майстэрства.

Тры дні на сцэне абласнога тэатра народнай творчасці гучалі песні, музыка, вершы...

Гледачы цёпла прынялі выступленні мужчынскага вакальнага квінтэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, жаночага вакальнага ансамбля з Бабруйска, жаночых дуэтаў з Касцюковіцкага, Клімавіцкага і Крычаўскага раёнаў.

Хораша спявалі салісты В. Сушко (Клічаўскі раён), Е. Угараў (Касцюковіцкі раён), А. Цэд (Бабруйскі раён), Н. Кавалёва (Крычаўскі раён), Н. Скварцова (Бабруйск), Н. Вахоцін, Л. Іваноў, Н. Чарнасава (Магілёў) і іншыя.

У адрозненне ад мінулых год у конкурсе прыняло ўдзел шмат музыкантаў. Запомніўся дуэт скрыпачоў конюха калгаса «Юны намунар» Нічыпара Кажэрскага і работніка бальніцы Івана Ткачова з Чавускага раёна. Дуэт выканаў некалькі беларускіх народных песень.

Добра прагучалі «Варшавянка» ў выкананні трыо трубачоў з Быхаўскага раёна і фантазія на тэмы рэвалюцыйных песень, з якой выступіў дуэт баяністаў у складзе А. Каспяровіча і Б. Чудоўскага з Мсціслаўскага раёна.

Багата было прадстаўлена мастацкае чытанне. Тут парадавалі самадзейныя артысты А. Хромчанка (Клічаўскі раён) і В. Міроненка (Клімавіцкі раён), якія добра чыталі вершы А. Пысіна і П. Глебкі.

Нямала вясёлых хвілін даставілі слухачам выканаўцы сатырычнага фельетона на міжнародныя тэмы С. Кружылаў і Ю. Напалкін.

На конкурсе выступала шмат частушачнікаў. Найбольшы поспех мелі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Касцюковіцкага раённага Дома культуры В. Ермачэнка і Н. Пацёмкіна. Самадзейныя артысты з Краснапольскага раёна — эканаміст калгаса імя Жданава В. Падарэўская і калгасніца Т. Пехцерава — з імпэтам выканалі частушкі «Славім мы перадавіцоў», тэкст якіх напісаў супрацоўнік раённай газеты В. Сямёнаў.

Абласны конкурс індывідуальных выканаўцаў Магілёўшчыны паказаў, што вырасла майстэрства многіх артыстаў-аматараў, што ўзбагаціўся іх рэпертуар сучаснымі творамі і народнымі песнямі і танцамі. Конкурс выявіў многа новых таленавітых людзей.

А. ГОЛЫШ.

На арбіце конкурсу людзі ўсіх узростаў: дзяды-скрыпачы з Чавускага раёна Нічыпар Кажэрскі і Іван Ткачоў і маладыя спевакі з Касцюкоўшчыны — Васіль Ермачэнка і Ніна Пацёмкіна.

Фота аўтара.

КВІНТЭТ СЯМ'І ПІСКУНОВІЧАЎ

Ёсць у Глыбоцкім раёне вёска Шарагі. Вёска як вёска. А слава аб ёй разышлася далёка за межы раёна. Жыве тут сям'я сельскіх музыкантаў Піскуновічаў. Гаспадар дома — калгаснік, ціпер пенсіянер Канстанцін Ігнатавіч — прыродны музыка. Ён іграе на цымбалах, гітары, скрыпцы, мандаліне. Яго жонка Агаф'я Алянсееўна, дачка Зіна з мужам, унук Лёня таксама музыкі. Словам, у іх сямейны музычны квінтэт.

Вечарам пасля работы, калі ўсе ў зборы, пачынаецца канцэрт. Гучаць то полечка, то «Лявоніха», то беларускія народныя песні...

У калгасе імя Дзімітрава, у які ўваходзіць вёска Шарагі, створан аркестр народных інструментаў. Сярод музыкантаў — Канстанцін Ігнатавіч і яго дачка Зінаіда.

Цяпер ледзь не штовечар у калгасным клубе ідуць рэпетыцыі. Спяваюць скрыпкі, звіняць цымбалы, іграюць баяны. Калгаснікі рыхтуюцца да раённага фестывалю мастацкай самадзейнасці.

М. БЕЛЬСКІ.

ВЕДАЦЬ, ШАНАВАЦЬ, БЕРАГЧЫ
УСТАНОЎЧЫ З'ЕЗД БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

У Мінску 7 снежня адбыўся ўстаноўчы з'езд Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Інфармацыя аб ім была змешчана ў мінулым нумары нашай газеты. Сёння мы друкуем справаздачу аб з'ездзе.

БЕССМЯРОТНЫ ЛЕТАПІС НАРОДА

Даклад старшыні аргкамітэта Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры акадэміка АН БССР Ц. С. ГАРБУНОВА

НАША Радзіма багатая на помнікі старажытнай і сучаснай гісторыі. Для нас яны — сведчанне высокай нацыянальнай культуры, мужнасці і гераізму народа.

Ахова гэтых помнікаў, выкарыстанне іх у інтарэсах народа — задача дзяржаўнага значэння. Яна была пастаўлена на парадак дня яшчэ У. І. Леніным адразу ж пасля Вялікага Кастрычніка.

Помнікі гісторыі і культуры — крыніца пазнання вопыту многіх пакаленняў нашых продкаў. Як сведчанне народных подзвігаў, патрыятычных, рэвалюцыйных, працоўных і ратных традыцый народа, яны — магутны сродак выхавання, неад'емная частка таго, што ўваходзіць у глыбокае ёмістае паняцце — Айчына.

Нарэшце, помнікі — гэта творы мастацтва.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны быў прыняты рад пастаноў, накіраваных на аднаўленне і ахову помнікаў. У рад важных актаў, звязаных з аховай культурнай спадчыны, увайшла пастанова Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР ад 19 чэрвеня 1965 года «Аб стварэнні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры». Ажыццяўляюцца буйныя мерапрыемствы па захаванню помнікаў.

Ацэньваючы намаганні ў гэтай галіне і іх вынікі, мы павінны ўлічваць як пацярпелі помнікі ў нашай краіне ў гады вайны. Матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці беларускага народа, якія захоўваліся стагоддзямі, нішчыліся і рабаваліся фашысцкімі захопнікамі. Акупанты спалілі, разбурылі і разрабавалі 209 нашых гарадоў і раённых цэнтраў, 220 вёсак, дзе захоўвалася культурная спадчына мінулых пакаленняў. За гады часовай акупацыі Беларусі гітлераўцы знішчылі больш 500 помнікаў культурнага і навуковага значэння.

Аднак прароцтвы буржуазных дзеячаў, якія сцвярджалі, што для савецкага народа назаўжды страчаны шматлікія помнікі культуры, не збыліся. Мы аднавілі разбураныя гарады і вёскі. Праведзена значная работа і па добраўпарадкаванню і рэстаўрацыі помнікаў.

У СУВЯЗІ з набліжэннем гістарычных дат — 50-годдзя Савецкай дзяржавы і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна — неабходна працягваць гэтую работу, прывесці ва ўзорны парадак усе помнікі, звязаныя з гісторыяй барацьбы за Савецкую ўладу, помнікі воінскай славы нашага народа.

Гітлераўскія каты знішчылі на тэрыторыі нашай рэспублікі звыш 2 мільёнаў 200 тысяч савецкіх грамадзян. Трэба зрабіць усё, каб захаваць памяць пра вядомых і невядомых герояў, уславіць подзвіг народа ў гады вайны.

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання і святкаваннем у 1964 годзе 20-й гадавіны вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у рэспубліцы створана больш 300 помнікаў баявой славы — абеліскі, скульптуры, мемарыяльныя дошкі. На радзіме многіх герояў устаноўлены помнікі і мемарыяльныя дошкі, іх імёнамі названы вуліцы, плошчы, школы. Створаны помнікі Героям Савецкага Саюза М. Гастэлу, В. Харужай, Л. Даватару і іншым. На радзіме Героя Савецкага Саюза М. Шмырова («Бацькі Мінная») ствараецца мемарыяльны музей. Па ініцыятыве грамадскіх арганізацый на Беларусі створана 5840 музеяў, пакояў і куткоў баявой славы, якія працуюць на грамадскіх асновах. Клапатліва дагледжаны магілы загінуўшых патрыётаў, помнікі, якія ўшаноўваюць подзвігі савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай.

Па пастанове ЦК КП Беларусі ў Лагойскім раёне ствараецца філіял Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён вырасце на месцы былой вёскі Хатынь, усе жыхары якой былі закатаваны фашысцкімі захопнікамі. У Мінску закладваецца мемарыяльны парк-помнік загінуўшым у барацьбе з фашызмам.

Многае зроблена і па добраўпарадкаванню гісторыка-рэвалюцыйных помнікаў і помнікаў воінскай славы. Прыведзеныя ў парадак будынкі-помнікі гісторыі і культуры выкарыстоўваюцца як памяшканні для музеяў, бібліятэк, дамоў адпачынку, санаторыяў, школ.

У гарадскім пасёлку Заслаўль на базе помніка XVI стагоддзя і гарадзішча X стагоддзя будзе створан філіял Дзяржаўнага музея БССР, які адлюструе гісторыю старажытных пасяленняў Беларусі. У сувязі з 900-годдзем Мінска намечана аднаўленне рэстаўрацыя Мінскага замчышча — месца ўзнікнення горада.

ЗА АПОШНІЯ гады Інстытут гісторыі і краязнаўчыя музеі правялі шмат археалагічных даследаванняў, каб праверыць стан вядомых і адшукаць, узяць на ўлік невядомыя помнікі. Аднак для правядзення поўнага ўліку помнікаў археалогіі неабходны час і актыўны ўдзел у гэтай важнай справе ўсіх членаў таварыства, якое створана. Трэба спадзявацца, што ў гэтую высакародную справу ўключацца краязнаўцы, настаўнікі, камсамольцы і піянеры, якія сталі і стануць членамі таварыства.

У нашай рэспубліцы сярод помнікаў, якія цяпер ахоўваюцца, 280 адносяцца да вельмі старажытных (археалагічных). Гэта тры пасяленні эпохі палеаліту, 19 неалітычных помнікаў, 6 селішчаў і 99 гарадзішчаў ранняга жалезнага веку і раннефеадальнага перыяду, каля 120 курганных груп прыкладна з 3200 насыпамі.

На першы погляд, спіс даволі вялікі. Аднак усяго на тэрыторыі рэспублікі вядома прыкладна шэсць тысяч археалагічных помнікаў. Такім чынам, пад аховай пакуль што менш, чым пяць працэнтаў.

Даследаванні апошніх год паказалі, што асабліва хутка знікаюць курганныя групы (у Столінскім, Іванаўскім, Лепельскім, Верхнядзвінскім раёнах). Старажытныя гарадзішчы Заронава Віцебскага раёна, Казінава і Лахі Гарадоцкага, Картавенкі Расонскага ператвараюцца ў кар'еры па здабычы пяску або гравію. Тэрыторыя паселішчаў каменнага веку і селішчаў перыяду ранняга жалеза нярэдка разбураецца ў выніку заворвання, пракладкі равоў або торфараспрацовак. Прыгадаем хоць бы Навасёлкі ў Петрыкаўскім раёне, Востраў у Пінскім, Снітава ў Іванаўскім, Зарэчча ў Бярозаўскім.

Работнікі Міністэрства культуры БССР прыклалі нямала намаганняў для выяўлення і рэгістрацыі рэшткаў старажытнасці, устанавілі цесную сувязь з навуковымі ўстановамі. Дзякуючы гэтаму ўдалося папярэдзіць знішчэнне такіх каштоўных для навукі старажытных помнікаў, як неалітычныя шахты ў Красным Сяле, гарадзішча ў Пінску і інш. Аднак не заўсёды гэтая дзейнасць сустракае разуменне на месцах. У інспектара міністэрства, на жаль, няма правоў забараніць работы, якія прыводзяць да разбурэння помнікаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Даклад друкуецца са скарачэннямі.

Фільматэка Гомельскага абласнога аддзела народнай асветы забяспечвае вучэбнымі кінафільмамі і дыяфільмамі 200 школ горада і бліжэйшых пяці раёнаў вобласці. У яе фондах больш 1200 копій вучэбных фільмаў. Нядаўна школы Гомеля атрымалі ад фільматэкі навінку — фонахрэстаматыю па літаратуры для 5—6—7 класаў. Кожны камплект хрэстаматыі складаецца з 50 грампласцінак з запісамі ўрыўкаў з твораў рускіх і савецкіх пісьменнікаў у выкананні вядомых артыстаў Савецкага Саюза.

На здымку — загадчык фільматэкі І. В. Леў (у цэнтры), лабарант 4-й школы рабочай моладзі Гомеля Ф. Р. Самсонаў (злева) і лабарант Гомельскага прафтэхвучылішча № 22 Д. А. Клачко праслухоўваюць запісы фонахрэстаматыі.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

ВЕДАЦЬ, ШАНАВАЦЬ, БЕРАГЧЫ

БЕССМЯРОТНЫ ЛЕТАПІС НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

На абласных устаноўчых канферэнцыях таварыства востра і прынцыпова гаварылася пра недахопы ў справе захавання помнікаў, прыводзіліся факты няправільнага стаўлення да іх.

Сёння многія помнікі гісторыі, архітэктуры, мастацтва, археалогіі ў дрэнным стане. Асабліва гэта датычыць тых, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці. Помнікі, якія знаходзяцца ў арандатараў, часта няправільна выкарыстоўваюцца, своечасова не рамонтуюцца, не рэстаўрыруюцца. Без усялякага дазволу мяняецца аблічча будынкаў, іх інтэр'еры, планіроўка.

Ёсць выпадкі неапраўданага разбурэння помнікаў (старажытная царква ў гарадскім пасёлку Шарашова Брэсцкай вобласці). Бывае, што драўляныя пабудовы гінуць з-за абыякавасці ўстаноў або асобных работнікаў (у вёсцы Святая Воля Брэсцкай вобласці згарэла царква, пабудаваная ў 1764 годзе).

Дрэнна клапоцяцца аб захаванні помнікаў у Віцебскай вобласці. Помнікі археалогіі разбураюцца нават паблізу самога абласнога цэнтра. У час будаўніцтва шашы Віцебск —Рыга трэці дарожнабудаўнічы раён разбурыў амаль усе гарадзішчы каля вёскі Зароўна. У 1965 годзе бульдозерам былі знішчаны два каштоўныя курганы ля вёскі Кострыца Лепельскага раёна. З кургановай бяруць пясок для гаспадарчых мэт, мясцовыя жыхары капаюць у іх ямы для бульбы і гародніны.

Манументальныя і прадметныя помнікі мастацтва і старажытнасці павінны быць узяты на ўлік, ніхто не мае права адвольна з імі абыходзіцца.

Трэба захоўваць прыгажосць помнікаў, зрабіць яе здабыткам народа.

Важная частка праблемы захавання помнікаў — беражлівае стаўленне да іх пры вырашэнні горадабудаўнічых задач. Вялікая адказнасць тут кладзецца на гарадскіх і раённых архітэктараў. Аблічча любога горада нельга ўявіць сабе без характэрных для яго помнікаў архітэктуры, мастацтва.

Аднак сёння мэтазгоднасць захавання помнікаў часам яшчэ вызначаецца воляю асобных работнікаў, не заўсёды дастаткова кампетэнтных. Ёсць факты неапраўданага разбурэння культавых пабудоў і твораў мастацтва, якія з'яўляюцца унікальнымі.

Увага членаў таварыства павінна быць звернута і на захаванне і аднаўленне мастацкіх рамёстваў у рэспубліцы. Мы маем добрыя ўмовы для развіцця рамёстваў, стварэння сапраўдных шэдэўраў, якія замянілі б безгустоўныя вырабы, што ідуць сёння шырокім патокам у продаж у якасці «сувеніраў».

Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры павінна прымаць актыўны ўдзел у разглядзе горадабудаўнічых праблем і распрацоўцы адпаведных рэкамендацый. Беларускія гарады могуць і павінны стаць захавальнікамі і прадаўжальнікамі лепшых нацыянальных архітэктурных традыцый, спрыяць гарманічнаму спалучэнню іх з новымі формамі горадабудаўніцтва.

ПРАБЛЕМЫ паляпшэння аховы помнікаў цяжка вырашыць, калі не наладзіць добрай прапагандысцкай работы.

Партыйныя, камсамольскія арганізацыі, асабліва ў апошні час, актыўна ўключаюць помнікі ў арсенал сваёй прапагандысцкай дзейнасці. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і абласныя краязнаўчыя музеі распрацавалі маршруты экскурсій і турысцкіх паходаў па памятных мясцінах і партызанскіх сцежках. Над многімі помнікамі ўзялі шэфства школы, прадпрыемствы, калгасы і саўгасы.

Аднак, нягледзячы на некаторае ажыўленне прапаганды помнікаў гісторыі і культуры, яе нельга прызнаць здавальняючай.

У нас мала адпаведнай літаратуры, мала рэпрадукцый, альбомаў, няма сувеніраў, якія прапагандавалі б славутыя мясціны.

Неабходна, каб цэнтральны савет таварыства пахадайнічаў перад Міністэрствам мясцовай прамысловасці БССР, Камітэтам па друку і Камітэтам па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР аб выпуску сувеніраў, мастацкіх паштовак, альбомаў, даведнікаў, навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў пра помнікі гісторыі і культуры Беларусі.

На наш погляд, неабходна выпускаць паштоўкі са здымкамі найбольш значных помнікаў, даведнікі, манаграфіі, сувеніры, стварыць папулярныя відавыя фільмы пра выдатныя помнікі архітэктуры.

Асабліва важнае значэнне мае прапагандысцкая работа сярод моладзі і дзяцей.

Савецкі Саюз, у тым ліку і наша рэспубліка, уступілі ў Сусветную арганізацыю аховы помнікаў. Маштабы і значэнне работы павялічваюцца. Шырокае выкарыстанне помнікаў у турызме — пытанне вялікай дзяржаўнай важнасці. Да славутых мясцін нашай рэспублікі едуць тысячы савецкіх людзей, турысты з-за мяжы. Трэба выкарыстоўваць гэта для прапаганды дасягненняў першай сацыялістычнай дзяржавы, для пашырэння ведаў пра Беларусь.

Неабходна падрыхтаваць да паказу помнікі, арганізаваць добрыя пад'езды да іх, падумаць пра гасцініцы, кафэ, наладзіць продаж сувеніраў, стварыць усе ўмовы для адпачынку наведвальнікаў. Няма сумнення, што выдаткі, укладзеныя ў турызм, хутка акупяцца. Трэба толькі сур'ёзна заняцца рэстаўрацыяй помнікаў, якія знаходзяцца на турысцкіх маршрутах.

Наспела неабходнасць стварыць пры Міністэрстве культуры БССР навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні па помніках гісторыі і культуры на гаспадарчым разліку.

УСЕ віды дзейнасці ў галіне аховы гістарычных і культурных помнікаў зараз ажыццяўляюць выканкомы мясцовых Саветаў і органы культуры. Яны і далей будуць выконваць гэтыя функцыі, маючы адпаведную матэрыяльную базу і ўладу. Але ім неабходна шырокая грамадская падтрымка. Аказваць такую падтрымку, удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, накіраваных на ахову помнікаў, — абавязак таварыства.

Мы павінны мець на ўвазе і патрыятычныя, народныя традыцыі —удзел насельніцтва ў мерапрыемствах па ўвекавечанню важных падзей гісторыі і памятных мясцін. Успомніце, колькі цудоўных помнікаў узведзена на народныя сродкі. Прыкладам гэтага можа служыць помнік славы героям абароны крэпасці-героя Брэста, які будзе ўзведзены на сабраныя працоўнымі сродкі.

Гэтыя і іншыя высакародныя прагрэсіўныя традыцыі народа трэба таварыству вывучаць і развіваць далей.

Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры сумесна з мясцовымі савецкімі органамі, акрамя тых задач, пра якія ўжо гаварылася, павінна вырашыць яшчэ адну — распрацаваць неабходныя мерапрыемствы, з дапамогай якіх можна да 1970 года прывесці ў належны парадак усе помнікі гісторыі і культуры. Арганізацыі, установы і гаспадаркі, якія не забяспечваюць захавання помнікаў, трэба перавесці ў іншыя будынкі. У першую чаргу трэба вывесці з Сафійскага сабора ў Полацку жніўны склад і архіў; з былой царквы ў Стрэшыне Гомельскай вобласці — склад райхарчгандлю; з храма абарончага тыпу ў вёсцы Сынкавічы — калгасны склад; з былога кальвінісцкага храма ў Смаргоні — склад райгандальаддзела: з храма абарончага тыпу ў Мала-Мажэйкаве Гродзенскай вобласці — калгасны склад; склад аблкнігагандлю — з былой Мікалаеўскай царквы ў Магілёве; склад і майстэрні райпрамкамбіната ў Быхаве — з былога замка Сапегі; склад райгандальаддзела ў Быхаве — з былога будынка часоў прыгоннага лаву; склад райхарчгандлю — з былога касцёла ў Мсціслаўлі.

Неабходна прыняць меры да рацыянальнага выкарыстання гэтых будынкаў — размясціць у іх музеі, бібліятэкі, дамы адпачынку, турысцкія базы ці іншыя культурна-асветныя ўстановы. Трэба ўвайсці з хадайніцтвам у выканкомы мясцовых Саветаў, каб на працягу бліжэйшых 2—3 гадоў прадпрыемствы, размешчаныя ў будынках, якія з'яўляюцца архітэктурнымі помнікамі, што знаходзяцца пад аховай дзяржавы, добраўпарадкавалі іх і сумежныя ўчасткі. Усе рамонтныя работы павінны праводзіцца пад наглядам кансультантаў-спецыялістаў і з дазволу органаў па ахове помнікаў.

Нараджэнне новага таварыства — яшчэ адно сведчанне далейшага развіцця савецкай дэмакратыі. Стыль работы ўсіх арганізацый таварыства павінен быць канкрэтным, па-ленінску дзелавым. Таварыства павінна стаць дзейснай арганізацыяй, сапраўды палепшыць стан аховы помнікаў, іх утрыманне і прапаганду.

Нішто слаўнае не павінна быць забыта ў гісторыі нашай Айчыны! Мы абавязаны захаваць усенародны здабытак — нашы помнікі, зберагчы подых вякоў, каб на ўвесь голас гучаў бессмяротны летапіс народа.

З нашай пошты

КОЛЬКІ ГОД БРЭСТУ?

Дакладна ўстанавіць узрост старажытнага горада вельмі цяжка. Звычайна гэта вызначаюць умоўна, згодна з першай пісьмовай звесткай аб ім. Але і тут часта ўзнікае шмат разыходжанняў. Дагэтуль даследчыкі спрачаюцца аб узросце аднаго з нашых самых старажытных гарадоў — Брэста. У многіх навуковых выданнях за год нараджэння Брэста бярэцца 1019. Такой думкі трымаецца, у прыватнасці, акадэмік Ціхаміраў у кнізе «Старажытнарускія гарады» (1956 г.). Пра гэта можна прачытаць і ў кнізе «Гісторыя БССР» (1961 г.).

Брэст пад назвай «Берестье» упершыню ўпамінаецца ў сувязі з міжусобнай барацьбой сыноў вялікага князя Уладзіміра Святаславіча за кіеўскі трон пасля смерці бацькі. Жорсткая і ўпартая барацьба разгарнулася паміж Яраславам, які ў гэты час знаходзіўся ў Ноўгарадзе, і Святаполкам, які апынуўся на троне ў Кіеве.

Святаполку належаў Тураў на Прыпяці, а з ім і вялікая тэрыторыя аж да берагоў Заходняга Буга. Каб лепш зразумець, як адбываліся падзеі, трэба ўлічыць, што Святаполку даводзіўся цесцем польскі кароль Баляслаў Храбры, які ўмешваўся ў гэтую барацьбу.

У Ноўгарадскім летапісе ёсць такі запіс: «В лето 6525 (1017 г. — Г. Ш.) Ярослав иде к Берестию». Але яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады вядомы даследчык старажытных летапісаў А. А. Шахматаў паставіў пад сумненне дакладнасць гэтага запісу. Яму здавалася нерэальнай тая паслядоўнасць падзей, аб якой гаварылася ў Ноўгарадскім летапісе.

З А. А. Шахматавым маўкліва згадзіліся многія даследчыкі. Толькі савецкі гісторык М. М. Ільін у 1957 годзе, пярэчачы Шахматаву, зноў звярнуў увагу на звесткі Ноўгарадскага летапісу пра Брэст і даказаў, што дата 1017 год, якая там упамінаецца, — вельмі верагодная. Цяпер да думкі М. М. Ільіна далучаюцца польскія даследчыкі.

Калі ўважліва вывучыць усе крыніцы, якія датычаць пастаўленага пытання, падзеі разгортваліся так. У 1016 годзе каля Любеча адбылася бітва паміж Святаполкам і Яраславам, у якой перамогу атрымаў Яраслаў. У 1017 годзе, згодна Ноўгарадскага летапісу, Яраслаў зрабіў паход на апошнюю крэпасць Святаполка — Брэст, які знаходзіўся каля граніцы з польскімі землямі. Вельмі важна, што гэта ноўгарадская звестка пацвярджаецца звесткамі саксонскага хроніка Цітмара, які жыў у той час.

З дапамогай Баляслава Храбрага, да якога ўцёк Святаполк, яму зноў удалося захапіць на некаторы час трон у Кіеве. Але ў 1019 годзе адбылася новая бітва паміж Святаполкам і Яраславам на рацэ Альце. Святаполк быў ушчэнт разбіты і ўцякаў праз Брэст далей ад граніц Русі. У тым жа годзе ён і памёр. Як бачым, у спрэчцы маюць рацыю тыя даследчыкі, якія трымаюцца даты 1017. Такім чынам, у наступным годзе, калі Мінск будзе святкаваць сваё 900-годдзе, Брэсту споўніцца 950 год, што таксама варта шырока адзначыць. Між іншым, старажытны Брэст знаходзіўся якраз на тым месцы, дзе зараз узвышаюцца бастыёны легендарнай Брэсцкай крэпасці.

Г. ШТЫХАЎ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР.

КЛОПАТ УСІХ, КЛОПАТ КОЖНАГА

ПАСЛЯ даклада разгарнуліся спрэчкі.

Таварыства працуе каля года, і за гэты час праведзена пэўная работа. Дэлегаты паведамілі, што робіцца на месцах, як разгортваецца рух па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Ва ўсіх абласцях створаны пярвічныя арганізацыі таварыства, у яго ўступаюць цэлыя калектывы — школы, краязнаўчыя музеі, тэхнікумы. Першым клопатам членаў таварыства сёння з'яўляецца пошук, улік, добраўпарадкаванне помнікаў і матэрыялаў мінулага. З вялікім энтузіязмам члены таварыства адшукваюць «сведкаў» воінскай славы нашых бацькоў і дзядоў, добраўпарадкоўваюць магілы герояў Вялікай Айчыннай вайны, ставяць манументы, абеліскі, устанаўліваюць мемарыяльныя дошкі.

У Карэліцкім раёне, напрыклад, як расказаў дырэктар Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Н. Собаль, робяцца помнікі землякам у кожным калгасе. У вобласці распрацаваны маршруты паходаў па мясцінах баявой славы. Па іх улетку прайшлі сотні экскурсій. У Мінскай вобласці, як паведаміў дэлегат Г. Гужавін, у мясцінах партызанскіх баёў і стаянак устаноўлена звыш двухсот мемарыяльных дошак. Вялікая работа па выяўленню памятных месц праведзена ў Брэсцкай вобласці. Аб гэтым падрабязна гаварыў дэлегат М. Шаўчук. Тут высвятляюць прозвішчы людзей, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, устанаўліваюць абеліскі, мемарыяльныя дошкі. Мяркуецца, што на працягу двух год будуць зроблены помнікі на ўсіх магілах і памятных месцах. Падобная работа вядзецца і ў іншых абласцях — у Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай.

Члены таварыства выказалі прэтэнзіі ў адрас Саюза мастакоў і Дзяржбуда БССР. Дэлегат М. Шаўчук правільна паставіў пытанне аб тым, што кожны помнік павінен быць і творам мастацтва, эмацыянальна ўздзейнічаць на чалавека. Аднак сёння даводзіцца бачыць многа стандартных, рамесніцкіх помнікаў. Трэба, каб у гэтую справу ўключылася як мага больш мастакоў, скульптараў, архітэктараў. Не хапае і некаторых матэрыялаў, зазначыў прамоўца. Так, напрыклад, няма дзе адліць мемарыяльную дошку з чыгуну, няма мармуру.

Адказваючы на гэты закід, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР У. Стальмашонак паведаміў, што справа ў недалёкім будучым палепшыцца. Зараз над новымі помнікамі працуюць многія скульптары і архітэктары. У радзе месц устаноўлены цікавыя манументы. Хутка адзін з беларускіх заводаў пачне рабіць чыгунныя мемарыяльныя дошкі, у будучым на ім наладзяць мастацкае ліццё.

Вялікую ўвагу члены таварыства ўдзяляюць пошуку, уліку, апісанню, замалёўкам помнікаў гісторыі і культуры. Дацэнт Беларускага політэхнічнага інстытута У. Чантурыя расказаў пра экспедыцыі студэнтаў, якія рабілі абмер і фіксацыю помнікаў архітэктуры. Гэтая работа праводзіцца ўжо амаль трынаццаць гадоў. Вывучана 60 аб'ектаў, зроблена 200 чарцяжоў, шмат замалёвак. Устаноўлена аўтарства многіх помнікаў. Выяўлены малавядомыя арыгінальныя архітэктурныя збудаванні, матэрыялы аб іх перададзены ў Дзяржбуд БССР з мэтай узяць іх на ўлік для аховы. На тэрыторыі рэспублікі, сказаў У. Чантурыя, знаходзіцца шмат помнікаў драўлянай архітэктуры. Захаваліся цікавыя культавыя збудаванні, старыя дамы, цэлыя ансамблі. Час асабліва бязлітасны да гэтых будынкаў. У. Чантурыя падтрымаў пастаўленае ў друку пытанне аб неабходнасці стварэння ў самы бліжэйшы час музея драўлянага дойлідства пад адкрытым небам. Гэты музей цалкам апраўдае сябе. Ён будзе незамянімым памочнікам у патрыятычным выхаванні моладзі.

Думку У. Чантурыя аб стварэнні этнаграфічнага музея пад адкрытым небам падтрымаў мастак М. Бельскі. Ён нагадаў, што сёння такія музеі ёсць у многіх краінах свету, у брацкіх рэспубліках. У. Стальмашонак дадаў, што трэба тэрмінова разгарнуць этнаграфічную экспазіцыю Дзяржаўнага музея БССР. На гэтыя матэрыяльныя помнікі адводзіцца ў новым памяшканні музея вельмі мала месца. Неабходна знайсці выйсце з гэтага ненармальнага становішча.

Г. Гужавін расказаў на з'ездзе аб памятных мясцінах і старых архітэктурных ансамблях старажытных беларускіх гарадоў — Нясвіжа, Заслаўля, Слуцка, Клецка, Барысава, многія з якіх сёння паспяхова рэстаўрыруюцца. Да гэтых помнікаў, зазначыў ён, трэба адносіцца з асаблівым клопатам, захоўваць іх і ўзнаўляць. У Мінскай вобласці ўзяты на ўлік 140 помнікаў. Трэба спіс гэты пашырыць. Дырэктар музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны С. Шчуцкі таксама гаварыў аб неабходнасці вывучаць і апісваць помнікі і матэрыялы гісторыі і культуры, аб тым, што члены таварыства павінны гэта рабіць навукова, пільна і беражліва ставячыся да розных дакументаў, на захоўванне якіх сёння часам звяртаецца мала ўвагі.

З трывогай гаварылі дэлегаты аб разбурэнні і знішчэнні многіх «сведак» нашай мінуўшчыны. Нядобрую справу робіць час, але яшчэ горай, калі ўмешваюцца маладасведчаныя людзі, якія не цэняць, не любяць, не шануюць нашай спадчыны, разглядаюць помнікі са сваёй вузка ведамаснай пазіцыі. Рэзка гаварыў пра чыноўнікаў, якія аддаюць загад знішчаць той або іншы гістарычны помнік, доктар гістарычных навук Л. Абецадарскі.

— Браканьера, які закідвае сетку ў рэчку,—сказаў ён,—закон карае, аднак браканьера, які разбурае помнікі мінулага, не прыцягваюць да адказнасці. Калі ў чалавека ўзнімецца рука на помнік — нельга верыць, што ён патрыёт!

Л. Абецадарскі зазначыў, што ў нас нікога не караюць за разбурэнне, перабудову архітэктурных збудаванняў. Напрыклад, у Мінску выдатным гістарычным помнікам з'яўляецца будынак тэатра імя Янкі Купалы. Тут адбылося шмат падзей, звязаных з устанаўленнем і развіццём савецкай дзяржаўнасці ў рэспубліцы. Але сёння фасад будынка перарэбілі, значна пагоршыўшы вонкавы выгляд. Рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» В. Вінаградаў у час здымак забруджаў вапнай тэрыторыю і перафарбаваў частку Мірскага замка.

Аб дрэнным утрыманні Мірскага замка гаварыў і Н. Собаль. Каб палепшыць справу, ён прапанаваў стварыць у замку турысцкую базу.

Н. Собаль прывёў таксама цэлы шэраг фактаў, якія сведчаць пра тое, што мы часам абыякава ставімся да памятак мінулых дзён. У Гродзенскай вобласці, напрыклад, не заўсёды добра ўтрымліваюцца помнікі XII—XVI стагоддзяў, гінуць унікальныя драўляныя збудаванні. У. Чантурыя зазначыў, што ў Гродна знеслі Фарны касцёл, карэнным чынам перабудоўваюць адну з самых старых вуліц—вуліцу Ажэшкі. Неабходна старыя збудаванні тактоўна ўключаць у новыя архітэктурныя ансамблі.

Ёсць выпадкі знішчэння архітэктурных помнікаў у Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай, Брэсцкай абласцях. У Мінску цалкам зносяць старадаўнія вуліцы ў раёне Нямігі. Гінуць некаторыя помнікі і ў вёсках. Дэлегаты з вялікім абурэннем гаварылі аб знішчэнні твораў мастацтва мінулага, шукалі шляхі, якія дапамогуць зберагчы помнікі гісторыі і культуры.

— Трэба, каб таварыства мела права хадайнічаць аб прыцягненні да адказнасці асоб і арганізацый, што псуюць помнікі,—сказаў дацэнт Магілёўскага педінстытута К. Пятроў.

Думку яго падтрымалі многія. Прапаноўваліся розныя канкрэтныя мерапрыемствы. У. Стальмашонак прапанаваў, напрыклад, каб кожнае канкрэтнае пытанне аб захаванні помніка вырашалася кампетэнтнымі спецыялістамі. Н. Собаль прапанаваў шырэй выкарыстоўваць для рэстаўрацыйных работ грамадскія сродкі.

— Я ўпэўнены,—сказаў ён, — што працоўныя жыва адгукнуцца і дадуць неабходныя грошы для рамонту і рэстаўрацыі помнікаў.

Ён прапанаваў стварыць рэстаўрацыйныя майстэрні, акрамя Мінска, і ў абласных цэнтрах увесці ў кожнай вобласці пасаду архітэктара, які б непасрэдна вёў работу па ахове помнікаў, кіраваў рэстаўрацыямі.

Загадчык сектара археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР У. Буцько засяродзіў увагу дэлегатаў на тым, што сёння ў сувязі з вялікім будаўніцтвам ідзе масавае знішчэнне археалагічных помнікаў. Пра іх мала хто ведае. Будаўнікі знішчаюць іх, пракладваючы дарогі, ставячы дамы. Неабходна выдаць зборнік пастаноў і інструкцый аб помніках, даслаўшы іх у кожны сельсавет, трэба выдаць археалагічную карту Беларусі, адрадзіць археалагічны рух у рэспубліцы.

У. Стальмашонак паставіў пытанне аб комплексным захаванні помнікаў. Часам мясцовыя ўлады лічаць помнікам толькі сцены будынка і знішчаюць унутранае ўбранне яго, дакументы, рэчы. Таму сёння гінуць старыя фрэскі, мазаіка, абразы, старыя кнігі, рукапісы, адзенне, перабудоўваюцца інтэр'еры.

Многія з гэтых бед, гаварылі дэлегаты, вынікаюць з таго, што людзі часам не ўяўляюць, якую вялікую гістарычную і эстэтычную каштоўнасць маюць помнікі старажытнасці. І таму таварыства павінна разгарнуць шырокую прапагандысцкую работу. Неабходна выкарыстоўваць друк, радыё, тэлебачанне, выдаваць кнігі, брашуры, лістоўкі аб асобных помніках і памятных мясцінах, чытаць даклады.

Намеснік старшыні Літоўскага таварыства краязнаўства і аховы помнікаў гісторыі культуры А. Стравінскас расказаў дэлегатам, якія цікавыя формы работы па прапагандзе і пошуку помнікаў ёсць у літоўцаў. Літоўскае таварыства выдала ўжо некалькі кніг. У прэсе яно мае пастаянныя рубрыкі. Члены таварыства выязджаюць у экспедыцыі на месцы, праводзяць конкурс па ахове помнікаў і г. д.

Дэлегаты з'езда шмат гаварылі аб тым, як павінна павесці работу Беларускае таварыства. Неабходна пашыраць гэты добраахвотны рух, прымаць у таварыства новых членаў, стварыць музеі на грамадскіх асновах, выкарыстоўваць у якасці баз абласныя і раённыя краязнаўчыя і гісторыка-рэвалюцыйныя музеі.

Дэлегаты з'езда выказалі ўпэўненасць, што дзейнасць таварыства прыняце вялікі плён—дазволіць адшукаць новыя помнікі гісторыі і культуры, «сведак» нашай воінскай славы, дапаможа захаваць каштоўныя матэрыялы, творы мастацтва мінулых стагоддзяў, утрымаць у належным стане архітэктурныя збудаванні, прынесці неацэнную паслугу турызму.

У звароце да грамадскасці Беларусі дэлегаты заклікалі ўсе арганізацыі, усіх працоўных садзейнічаць вялікай і пачэснай працы таварыства, клапаціцца аб захоўванні помнікаў гісторыі і культуры, ведаць, шанаваць і зберагаць для сучаснага і будучага творы мастацтва, неацэнныя сведчанні нашай слаўнай гісторыі.

«ДЗЯЎЧЫНА МАЁЙ МАРЫ» Ў... «НАВІНАХ ДНЯ»

Хутка год, як у Мінску створаны спецыяльны кінатэатр «Навіны дня», закліканы задаволіць цікавасць гледачоў да хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў. Такіх карцін у нашай краіне выпускаецца шмат. Але ўсё часцей мы бачым на афішах кінатэатра фільмы «Дзяўчына маёй мары», «Бадзяга», «Шлюб па-італьянску».

У чым прычына? Няўжо нельга цалкам спецыялізаваць адзіны ў сталіцы тэатр кінахронікі?

— У нас вялікі фінансавы план, — скардзіцца дырэктар кінатэатра М. Пахрыцын.

Білет на дакументальны фільм сапраўды каштуе ў некалькі разоў менш, чым на мастацкі. Гарадская кантора кінапракату, відаць, у нечым памылілася, калі ўстанавіла тэатру высокі фінансавы план. Але разбяромся, ці ўсё робіць і дырэкцыя кінатэатра, каб зацікавіць гледачоў.

Зайдзіце ў залу, калі ў «Навінах дня» ідуць тэматычныя паказы. Палова крэслаў, як правіла, пустае. Гэта перш за ўсё вынік дрэннай рэкламы. Ніхто з гледачоў не ведае планаў кінатэатра не толькі на месяц наперад, але нават на дэкаду. Людзі трапляюць у кінатэатр часцей за ўсё выпадкова. Над касай у вестыбюлі вісіць, напрыклад, аб'ява аб продажы абанементаў. Я спытаўся ў касіра, якія карціны будуць дэманстравацца ў бліжэйшыя 15 дзён. «Не ведаю», — паціснула яны плячыма. Хто ж на такіх умовах будзе купляць абанемент?

Дырэкцыя не займаецца «арганізацыяй» гледача. Фільмы ж часта маюць дакладны «адрас». Фільмы «Вопыт навуковай арганізацыі працы на Уралхіммашы», «Умела кіраваць вытворчасцю» маюць цікавасць для інжынерна-тэхнічных работнікаў. Але ў кінатэатры нічога не зрабілі, каб наладзіць прагляд гэтых стужак калектывамі прадпрыемстваў. Кінатэатр увогуле вельмі дрэнна рэкламуе фільмы. На афішах пішацца толькі назва, да таго ж афішы аднастайныя, шэрыя. Не выкарыстоўваецца шырока ў мэтах прапаганды рэпертуару кінатэатра радыё, тэлебачанне, друкаваная і светлавая рэклама. Афіш «Навін дня» няма на Ленінскім праспекце, хоць кінатэатр—у двух кроках ад яго.

Нельга, каб у тэатры, які павінен знаёміць нас з навінамі кіно, ішлі «камерцыйныя» стужкі, што ніякіх адносін да кінахронікі не маюць. Дальбог, «Дзяўчына маёй мары» не выратуе «Навіны дня».

С. БАРМАШ,
палкоўнік у адстаўцы.

ПАКАЗВАЮЦЬ МАСТАКІ-АМАТАРЫ

Звыш 350 твораў жывапісу, скульптуры і графікі прадставілі самадзейныя майстры пяці раёнаў рэспублікі на выстаўку ў Маладзечанскі Дом народнай творчасці. Яна прысвечана 50-годдзю Савецкай улады. Цікавыя работы разьбяра па дрэву пенсіянера з Івянца А. Пупко: бюст рыцара рэвалюцыі Ф. Э. Дзяржынскага, творы «Далоў вайну», «Жняя», «Мая доля». У гэтым жанры плённа працуе і пашытальён Крывіцкага аддзялення сувязі Л. Шостак. Увагу наведвальнікаў прыцягваюць бюст Леніна, «Дэкрэт аб міры», унікальныя вазачкі з бярозы.

Калгаснік І. Занковіч з Вілейскага раёна ў графічных лістах адлюстраваў працоўныя будні, вучобу і адпачынак сельскіх жыхароў. Прыцягваюць увагу самабытныя пейзажы рабочага саўгаса «Чарнелі» П. Шчалканогава, арыгінальныя самаробкі маладзечанскага ўрача В. Савановіча.

На здымку — наведвальнікі знаёмяцца з экспанатамі выстаўкі.

Фота П. НАВАТАРАВА. (БЕЛТА).

Іван Шамякін

ТЫЯ ДНІ Ў НАШЫМ ЛЕСЕ

Урывак з рамана

Раман, над якім я працую цяпер, — не пра вайну. Галоўныя падзеі яго адбываюцца ў наш час, у горадзе. Але цэнтральны персанаж Іван Антанюк, былы партызанскі камандзір, буйны гаспадарчы работнік, па ходу сюжэта ў розных сітуацыях, у сутычках з рознымі людзьмі ўспамінае для сябе ці расказвае другім некаторыя эпізоды са сваёй партызанскай біяграфіі. Урывак, які я прапаную ўвазе чытачоў, — адзін з такіх успамінаў героя пра тое, як вялікая бітва пад Масквой адгукалася ў глыбокім тыле, у нашых партызанскіх лясах, як партызаны памагалі перамозе ў гэтай гістарычнай бітве.

АЎТАР.

ТАДЫ таксама ішоў снег. Але не такі ласкавы, ціхі. Гуляла завіруха. Выла. Лес гудзеў і трашчаў. Нават там, у пушчы, у самым яловым гушчары, на нашай маленькай партызанскай ўзлянцы трохі не збівала з ног. А што рабілася ў полі!

Не. Яе прывезлі, здаецца, не ў тую памятную завіруху. Завіруха пачалася пазней, калі мы вярнуліся з рэйда. Ды хіба адна была, такая завея? У пачатку тае зімы снег ішоў амаль кожны дзень. Да пачатку снежня намяло — не прайсці, не праехаць. І настрой у мяне быў сабачы. Часам хацелася завыць, як вылі тыя галодныя ваўкі, што падыходзілі ўначы да лагера. О, каб такі настрой быў у аднаго мяне — то паўбяды. Здавалася, толькі два чалавекі не падалі духам — Будыка і Павел.

Цяпер партызанскія генералы ўсе пішуць мемуары. І вынікае з тых кніжак, што ўсё было проста з пачатку да канца. Былі цяжкасці, нястачы, страты, але, маўляў, ніхто з іх, вялікіх стратэгаў, ні на хвіліну не сумняваўся ў моцы Чырвонай Арміі, у гераізме народа, а гэтая вера іх перадавалася кожнаму партызану.

Я — грэшны. Я таксама верыў у мудрасць партыі, у свой народ. Але я бачыў адступленне арміі. І слухаў радыё. У атрадзе меліся два прыёмнікі. І на маю бяду — Валька Будыка валодаў нямецкай мовай. Каб жа ў тыя дні троху шырэй паведамлялі нашы няхай нават самыя цяжкія навіны. Але Масква перадавала бадзёрую музыку і скупыя зводкі Саўінфармбюро аб упартых ці мясцовых баях на кірунках тых гарадоў, якія даўно ўжо — гэта мы ведалі пэўна — засталіся ў тыле нямецкай арміі.

А ў пушчы выла завіруха. Замяло дарогі. Трашчалі маразы. Семдзесят чалавек хадзілі ў разведку ці сядзелі ў зямлянках, пракураных, цесных, адкуль гарачыню распаленай да чырвані «жалезкі» магло выдзьмуць ветрам за тры мінуты — толькі адчыні дзверы. Семдзесят чалавек. Можа, і нямала для таго часу. Але ўзброеныя хто чым, з малым боезапасам. Без вопытнага камандзіра. Адкуль у мяне, у загадчыка райсельгасаддзела, мог быць вайсковы вопыт? Добра, што ў верасні да нас далучыўся Будыка з групай сапёраў.

Вы былі мудрыя, цяперашнія мемуарысты. А я нават не ведаў тады, якім чынам здабываць харч для сямідзесяці чалавек. І пазней, калі мы ўсё ведалі, у любы час маглі звязацца з цэнтрам, усё ўмелі, гэта заставалася праблемай у нашай

ПАЛЕМІКА

ПРА ЎЯЎНЫЯ НЕДАХОПЫ

Кастусь ГУБАРЭВІЧ

ГАЗЕТА «Літаратура і мастацтва» правільна, па-мойму, робіць, калі дае магчымасць выказаць на сваіх старонках розныя погляды на адзін і той жа твор. Можа, гэта не заўсёды абавязкова, але часам бывае проста неабходна.

Такая неабходнасць узнікла, напрыклад, у адносінах да аповесці «Вікторыя» А. Адамовіча. Узнікае яна, на маю думку, і пасля рэцэнзіі Георгія Коласа на спектакль «Дом на Сонечнай» па п'есе А. Маўзона («Дом на Сонечнай, яго гаспадары і госці», «Літаратура і мастацтва» за 15 лістапада).

Размова будзе не пра спектакль. Менш за ўсё пісаў пра спектакль і Георгій Колас. «Прэм'ера мела поспех, мы глядзелі спектакль з цікавасцю і хваляваннем», — паведамляе аўтар, і я веру яму. Цяжка пагадзіцца з іншым: як прачытаў і растлумачыў Г. Колас п'есу, аналізу якой прысвяціў большую частку свайго артыкула.

Я не хачу адмаўляць права крытыка на свой погляд, сваё бачанне п'есы. Але пры адной умове: калі гэта «сваё» не пярэчыць аб'ектыўнай сутнасці твора.

Пра што п'еса А. Маўзона? «Пакінуўшы на сумленні аўтара ўсе дэкларацыі аб ролі мастака ў жыцці і аб яго сапраўдным прызначэнні, тэатр убачыў у п'есе драму гонару», — вызначае Г. Колас. І сапраўды. Выстаўком адхіліў карціну вядомага, славутага мастака Шыбанава. Калі б гэта здарылася на пачатку творчага жыцця, магчыма, было б лягчэй перажыць такое, а ў зеніце славы гэта сапраўды драма, і Шыбанаў перажывае яе балюча і востра.

Але калі б А. Маўзон напісаў, а тэатр паставіў толькі драму гонару, наўрад ці мела б прэм'ера поспех. Так, у Шыбанава драма. Але — не гонару. Драма творчага краху. Яна заканамерна вынікала з усяго яго папярэдняга жыцця.

Калісьці многія творы Шыбанава былі «сугучныя» свайму часу і не столькі, відаць, глыбінёй майстэрства і таленту, колькі «тэмамі». Яны імпанавалі нечым густам, у першую чаргу фіміямнай крытыкі, якая абкадзіла імя Шыбанава, вынесла яго на «арбіту». Яго пераканалі, што «там, дзе ён стаіць, — ужо мастацтва». А мастацтва было не там. Шыбанаў зразумеў гэта, толькі перажыўшы глыбокі псіхалагічны шок пасля правалу сваёй карціны, над якой ён працаваў два гады. «Калі гэта дрэнна (а Шыбанаў, нарэшце, згадзіўся, што карціна сапраўды дрэнная), дык дрэнна ўсё, што ты рабіў, зрабіў дагэтуль, чым ты сам усё жыццё ганарыўся і за што атрымаў усе выгоды жыцця». Так сказаў сам Шыбанаў. Пра самога сябе. А так сказаць пра самога сябе можна, толькі перажыўшы драму ўласнага краху.

Багутоўскі («Старонка дзённіка» А. Карнейчука) яшчэ не перажыў такой драмы. Праўда, становішча яго не менш драматычнае, бо рана ці позна і яго не міне крах. Але не было ніякай падставы Г. Коласу радніць Багутоўскага і Шыбанава па тых толькі адзнаках, што абодва яны «лаўрэаты, вядомыя, прызнаныя», да абодвух прыязджаюць — да першага сын, да другога бацька, і абодвух крытыкуюць: Багутоўскага — сын, а Шыбанава «нарачоны бацька» Ермакоў. (У п'есе, дарэчы, няма ніякага нарачонага бацькі, ёсць былы матрос Ермакоў, які калісьці памог групе хлапчукоў, у тым ліку і Шыбанаву, пазбавіцца ад беспрытульнасці).

Калі Ермакоў так ці інакш крытыкуе карціну Шыбанава, то сын Багутоўскага проста трушчыць скульптурныя творы бацькі, і не за тое, што яны не падабаюцца яму, а за тое, што Багутоўскі не прымае сына пасля палону і лічыць апраўданым недавер да яго. Між іншым, у п'есе «Старонка дзённіка» наогул няма сцэны з прыездам сына і разгромам майстэрні. Гэта дачка Багутоўскага расказвае, што яна **хоча напісаць** п'есу пра тое, як сын Багутоўскага прыйшоў з вайны ў бацькаў дом...

Дзе ж тут «падабенства», а тым больш — перайманне «сюжэта-вандраўніка», якое інкрымінуецца А. Маўзону? Праўда, Г. Колас мае на ўвазе не толькі «Старонку дзённіка». Ён прыгадаў і «Пяць вечароў» А. Валодзіна, «Чорныя птушкі» М. Пагодзіна, «Зацейніка» В. Розава, «Я так хачу» Р. Раманава, шукаючы падабенства з імі ў п'есе «Дом на Сонечнай». У чым жа гэта падабенства? У першых чатырох п'есах душэўна знявечаныя героі цураюцца свайго ранейшага жыцця, кудысьці едуць і займаюцца абычым. Але якое яны маюць падабенства з мастаком Фёдарам з п'есы А. Маўзона? Хіба толькі тое, што Фёдар таксама пакінуў горад і паехаў працаваць на вёску.

Але не таму, што яму было ўсё роўна, што рабіць, Перад ім не стаяла пытанне, якую спецыяльнасць выбраць, як гэта было з героямі тых чатырох п'ес. Пасля сканчэння інстытута Фёдар прыехаў на вёску выкладаць маляванне. Часткова таму, што Валя, дачка Шыбанава, якую ён кахаў, выйшла за другога, а больш таму, што ўжо на пачатку свайго творчага жыцця зразумеў: не быць яму мастаком у высокім сэнсе слова. (Гэта тое, чаго не зразумеў у свой час Шыбанаў).

Ён не адчуў у сабе таленту, не «абяцаў у сваёй справе дасягнуць нязведаных вяршынь». А быць раменнікам — не варта. Хапае і без яго. І — каб астацца чыстым перад жыццём і сваім сумленнем — лепш выхоўваць будучых Рэмбрантаў. А можа і Шыбанавых... Фёдару няцяжка будзе разгледзець сярод сваіх вучняў будучага Шыбанава.

І тут хочацца яшчэ раз звярнуцца да таго, пра што ж п'еса? Так, гэта драма творчага краху. Але яна прымушае думаць і «аб ролі мастака ў жыцці і аб яго сапраўдным прызначэнні». Дарэмна гэтыя словы аўтара названы крытыкам «дэкларацыяй». Іменна яны вызначаюць сутнасць п'есы. У п'есе два мастакі, дзве жыццёвыя і творчыя пазіцыі. Аднаму хапіла волі і смеласці паглядзець праўдзе ў вочы, другі збаяўся. Раз'яднаць іх нельга, бо парушыцца кантрастнасць, без якой п'еса не можа існаваць, як не могуць самі па сабе існаваць Шыбанаў і Фёдар, бо яны з адной, а не з дзвюх п'ес, як гэта сцвярджае Г. Колас. І не так ужо важна, ці сустракаецца Фёдар з Шыбанавым, каб хоць раз пагаварыць аб творчасці свайго былога настаўніка. Фёдар надзвычай добра ведаў усё тое, што напісаў Шыбанаў, і яго нікольні не здзівіла няўдача славутасці. Ужо адна назва карціны «Радасць магла адбіць у яго жаданне глядзець яе, тым больш размаўляць з аўтарам, які пісаў сваю «Радасць» з халодным сэрцам. І добра, што А. Маўзон не прымусіў іх гаварыць тое, што і без слоў зразумела.

І разам з тым яны «размаўляюць». Не літаральна, не ў тэксце п'есы, а ў падтэксце. Фёдар заяўляе сябе ў пачатку першай карціны. Мы дазнаёмся, што ён адмовіўся ад абароны дыплома і паехаў «мастаком-педагогам» на вёску. Адначасова заяўляе сябе і Шыбанаў: выстаўком адхіліў яго «Радасць». І ўжо да канца п'есы не пакідае роздум аб ролі і прызначэнні мастака: было б, відаць, лепш, каб і Шыбанаў у свой час зрабіў так, як Фёдар... Пэўна, больш карысці было б ад чалавека і для яго самога. І яшчэ: як важна «знайсці» самога сябе, знайсці сваё сапраўднае прызначэнне. Асабліва ў мастацтве...

Вось так сустракаюцца і «размаўляюць» у п'есе Фёдар і Шыбанаў. І, на маю думку, так больш цікава.

Насцеражыў мяне яшчэ адзін дакор Г. Коласа ў адрас п'есы і яе аўтара. Шыбанаў сустрэўся з былым матросам Ермаковым — чалавекам, які выратаваў яго ў свой час і тым самым вывеў на шырокі жыццёвы шлях. І можна паверыць, што ў Шыбанава абудзілася глыбокае пачуццё ўдзячнасці, з'явілася сапраўднае натхненне для работы над вобразам матроса, які вядзе за сабой босых, абшарпаных беспрытульнікаў. Багутоўскі таксама хоча напісаць партрэт — «гераічны вобраз рабочага класа. Напісаць... гэтакім суровым, каб адчувалася непахісная магутная сіла...»

Тое, што два мастакі ў дзвюх розных п'есах пішуць партрэты, яшчэ нічога асаблівага не азначае. Пісалі да Карнейчука і да Маўзона. І ў п'есах, і ў раманах. Толькі чаму пісалі? Вось тут Шыбанаў з Багутоўскім і разыходзяцца. У Багутоўскага партрэт рабочага — чарговы «твор» на «актуальную» тэму, у Шыбанава — можа адзіны ў яго жыцці твор, які ён напіша «крывёю сэрца». І тое, як уяўляе Шыбанаў вобраз матроса («Высокі, прыгожы матрос у бесказырцы, у бушлаце... У яго быў нейкі свой, свой крок. Шырокі такі. А за матросам — мы. Абадраныя, босыя, брудныя, галодныя...»), ніколькі не бянтэжыць, бо можна намаляваць і так. Толькі каб гэта было таленавіта. (Былі ж калісьці ў Шыбанава творчыя ўзлёты!) Ва ўсякім разе жаданне Шыбанава не дае падставы для іроніі... І нічога страшнага няма ў тым, што мастак хоча гераізаваць Ермакова (толькі не так, як «гераізуе» Багутоўскі. Шыбанаў бачыць «свой» крок у матроса), бо вельмі ж апрыкрыла «дагераізацыя». Апрыкрыла пустая шматзначнасць, якая імкнецца часам выжыць са сцэны і экрана страснае грамадзянскае слова, думку, пачуццё. Усё гэта, бываючы, заганяюць пад зняважлівую рубрыку «газетных дыялогаў», «публіцыстычных перлаў», «трыбунных прамоў».

Цікава, пад якую рубрыку падагналі б некаторыя сённяшнія крытыкі такія «публіцыстычныя перлы»: «...все эти Анны, Мавры, Пелагеи с раннего утра до потемок гнут спины, болеют от непосильного труда, всю жизнь дрожат за голодных и больных детей, всю жизнь боятся смерти и болезней, всю жизнь лечатся, рано блекнут, рано старятся и умирают в грязи и вони... голод, холод, животный страх... загородили им все пути к духовной деятельности, именно к тому, что отличает человека от животного»... Спытай другога слабога на памяць: адкуль гэта? — З газетнага артыкула аб дарэвалюцыйным становішчы жанчыны!

А гэта — Чэхаў. Найтанчэйшы пісьменнік, які менш за ўсё карыстаўся «адкрытым тэкстам». І не пабаяўся пакласці гэтыя словы ў вусны мастака («Дом з мезанінам»), калі хацеў выказаць яго грамадзянскае абурэнне.

А хто не памятае гнеўны твор прагрэсіўнага амерыканскага рэжысёра Стэнлі Крамера «Нюрнбергскі працэс», які ўвесь пабудаваны на вострых, у пераносным і літаральным сэнсе, «трыбунных прамовах»?.. Але які гэта маштабны мастацкі твор!.. Дык навошта ж зняважліва ставіцца да ўсяго таго, што і як гаворыць мастацтвазнаўца Румянцава Шыбанаву адносна яго карціны? А гаворыць яна горкую праўду і якраз тымі словамі, да якіх прызвычаіла яе прафесія. (Чаму, між іншым, мы павінны ігнараваць уплыў прафесіі на характар мыслення і мовы чалавека, калі гэта мова нават «публіцыстычная» або «газетная»? А можа аўтар знарок зрабіў так, каб вобраз быў сапраўды жыццёвым?). Адзнакай мастацкага вобраза можа быць і дрэнная, «казённая» мова. І тут менш за ўсё вінаватым бывае аўтар. І Румянцава гаворыць у п'есе «сваёй», ёй уласцівай мовай. І не такой ужо «казённай», дарэчы...

Я не хачу поўнасцю «апраўдваць» «Дом на Сонечнай». У п'есе ёсць недахопы. Калі ўжо, напрыклад, казаць, аб «цераймаННях», то А. Маўзона хутчэй за ўсё можна было б папракнуць у «самаперайманні». Чым, скажам, Ігар Матыль з «Дома на Сонечнай» не родны брат Барыса Мякішава («Пад адным небам»)? Або пляменніца (а не домработніца, як яе называе Г. Колас) жонкі Шыбанава Дуся Поўная. Ці ж не тая ў яе «фактура», што і ў Людмілы («Пад адным небам»)? Тая таксама поўная, нават жартуе са сваёй паўнаты. Дуся наогул не з абавязковага асартыменту п'есы. Вобраз чыста арнаментальны. Ён мог быць, а мог і не быць.

Аб недахопах сапраўдных можна было б гаварыць куды больш, калі б не спатрэбілася аспрэчваць так доўга недахопы ўяўныя.

«ПАРТЫЗАН» РЫХТУЕЦЦА РАСЧЫНІЦЬ ДЗВЕРЫ



На вуліцы Талбухіна ў Мінску вырас новы будынак з бетону і шкла. Гэта — шырокафарматны кінатэатр «Партызан». Ідуць апошнія падрыхтаванні да яго адкрыцця. Фотакарэспандэнт М. Рубінштэйн пабываў у новым кінатэатры. На яго здымках — агульны выгляд кінатэатра; скульптар Я. Печкін, які заканчвае работу над барэльефам «Партызаны», што ўпрыгожвае фае.

ПАДПОЛЬШЧЫКАМ БАБРУЙСКА ПРЫСВЕЧАНА

Актыўна дзейнічалі ў гады фашысцкай акупацыі бабруйскія падпольшчыкі. Акупанты не ведалі спакою ні ўдзень, ні ўночы. Многім мужным патрыётам не давялося дажыць да чаканай перамогі. Ім, верным сынам і дочкам Радзімы, і прысвячае сваю новую работу Бабруйскі музычна-драматычны тэатр. П'есу «Вас шукае гестапа» напісалі галоўны рэжысёр тэатра Уладзімір Амельчанка і бабруйчанін Міхаіл Беразінскі. Дырыжор тэатра Усевалад Ражкоўскі піша музыку.

Бабруйскія артысты мяркуюць паказаць сваю новую работу гледачам нашай сталіцы ў пачатку будучага года.

Сярод кніг

ГРАНІ САМАБЫТНАГА ТАЛЕНТУ

Я. ГЕРЦОВІЧ

Прызнаюся, што на гэты раз не ведаю, з чаго пачаць. У кнізе Івана Пташнікава «Сцяпан Жыхар са Спешыц» сем апавяданняў — і кожнае з іх адметнае, пра кожнае абавязкова хочацца сказаць добрае слова. Калі я чытаў «Алёшку», то думаў, што нейперш скажу, хоць гэта і не нова, пра высокую трагедыйнасць, якая збліжае гэты твор з аповесцю Івана Пташнікава «Лонва». Гэты рэквіем дачасна абарванаму маладому жыццю, гэтую мужную песню, з якой ніводнага слова не выкінеш, звычайнай прозай ніяк не назавеш. Але з гэтакім жа правам я мог бы, спасылаючыся на таленавітае апавяданне «Алені», павесці гаворку пра ўменне пісьменніка славіць жыццё, знаходзіць і раскрываць у кожнай з'яве яго непаўторную паэтычную душу. І гэта таксама была б чыстая праўда.

А хіба не праўда, што, прачытаўшы апавяданне «Прахадная пешка», нашы сатырыкі ахвотна прымуць Івана Пташнікава ў свой гарачы цэх у якасці майстра дасціпнага смеху? Аднак не спяшайцеся з вывадамі, бо пра апавяданні «Калістрыха» і «Сцяпан Жыхар са Сцешыц» захочацца сказаць: такія творы пад сілу толькі вельмі назіральнаму і тонкаму бытапісальніку, які добра ведае жыццё і таленавіта яго адлюстроўвае. Што ж атрымліваецца? Не пісаць жа сем розных рэцэнзій на адну кнігу празаіка. Ды і сама кніга вабіць менавіта сваім адзінствам, бо нідзе Іван Пташнікаў не здраджвае сваёй звыклай творчай манеры. Адзінства — пры шматграннасці, разнастайнасць — пры наяўнасці нейкіх вельмі істотных агульных рыс...

Іван Пташнікаў нястомна шліфуе свой талент. Зусім зразумела, што пры шліфоўцы ўсё часцей акрэсліваюцца новыя грані, якія дагэтуль толькі ўгадваліся. Лірызм, трапяткая любоў да роднай прыроды, замілаванае стаўленне да беларускіх лясоў, да няяркай, неэкзатычнай, але непаўторнай у сваёй самабытнасці пекнаты нашых краявідаў заўжды спадарожнічалі пісьменніку. У ранніх творах пісьменніка гэтым зерням чыстай паэзіі нярэдка было цяжкавата прабіцца на першы план, бо замінала празмерная дэталізацыя ўсяго напатканага і ўбачанага ў падарожжах па знаёмых змалку дарогах Прывілля. Нават у першых раздзелах, напісанай на адным дыханні аповесці «Лонва» яшчэ крыху бракуе выбарачнасці, эканомнасці. Такога ніяк не скажаш пра апавяданні «Алёшка» і «Алені», бо гэта песні ў прозе.

Дзесяцігадовы Алёшка з аднайменнага апавядання вельмі добра зразумеў бы крыху старэйшага за яго Юрку Даліну з аповесці «Лонва». Абодвух хлапчукоў вайна дачасна зрабіла «мужчынамі». Дзе ўжо тут да дзіцячых гульняў, калі Юрка змушаны дзень пры дні працаваць у лесе, каб памагчы хвораму бацьку карміць сям'ю, а Алёшка толькі і думае, што «не будзе многа есці бульбы», бо з голаду маці «пачынае пухнуць, як і Марыля, што асталася адна пасля блакады».

Ёсць і даволі істотная розніца: хлопчык з дашчэнту зруйнаванай ворагам Лонвы да трагічнай гібелі пражыў год у вызваленай вёсцы, бачыў, як загойваюцца раны на целе зямлі, адчуваў, што ўсім пакутам неўзабаве прыйдзе канец. Таму і спадзяванні яго, хлапечыя мары, былі надзвычай аптымістычныя. Алёшка ж не паспеў нават аглядзецца, падумаць пра заўтрашні дзень, бо чужынцаў яшчэ толькі-толькі выгналі з роднай вёскі і імі кішэў блізкі лес. Загінуў дзесяцігадовы хлопчык як салдат-разведчык, які заўважыў ворага і спяшаўся да сваіх, каб папярэдзіць людзей пра вялікую небяспеку.

Незабыўнасць і непаўторнасць вобразу Алёшкі надае арганічнае спалучэнне хлапчукоўства і ранняй сталасці, дзіцячай цікаўнасці і зусім немалечай разважлівасці.

Наша знаёмства з Алёшкам цягнулася лічаныя хвіліны — пакуль хлопчык самавольна ішоў на пошту і, заўважыўшы гітлераўцаў, што рваліся з акружэння, бег назад, бо «яны могуць уцячы. За Сушкавам лес, дабягуць і — прапала». За гэтыя кароткія хвіліны чытач палюбіў Алёшку, бо пісьменнік здолеў прыадкрыць перад намі неспакойную хлапечую душу. Разам з Алёшкам слухаеце вы, як стракочуць у васільках конікі, як голас тэлефаністкі тужліва кліча: «— Я зямля! Я зямля! Я зямля!..» Вы таксама хочаце здагадацца — ці то паўзе лагучнай туман, ці гэта паднялі пыл танкі ў суседнім лесе. Крычаць перапёлкі, чыкаюць і чыкаюць конікі, недзе гудуць самалёты. Стухаюць чырвоныя палосы над лесам, дзе зайшло сонца. Ці ж хочацца верыць, што менавіта ў такую хвіліну сухі стрэл аднекуль з жытоў заглушыць усе такія знаёмыя веснавыя галасы, пагасіць усе маляўнічыя фарбы і з падпашша выпадуць трохкутнічкі. Алёшка ўжо не падыме іх... Балюча і табе, чытачу, бо так рана абарвалася добрае знаёмства з хлопчыкам, якога ты прапісаў у сваім сэрцы.

Прапішы, чытач, у сваім сэрцы і маленькую Ірку, гераіню апавядання «Алені». Гэтая дзяўчынка — таксама шукальніца, якая ведае і знаходкі, і страты, і горыч першых расчараванняў. Яна ўмее слухаць цішыню, што плыве з пушчы, плыве ракою ў стромкіх берагах, якая ніколі не разліваецца і не стогне. У галерэі герояў Івана Пташнікава, надзеленых паэтычнай душою і чуйным сэрцам, Ірка вылучаецца высокай эмацыянальнасцю і абвостранасцю сваіх дзіцячых пачуццяў. Такую душу вельмі лёгка параніць, а загаіць потым яе рану даволі цяжка. Дзяўчынка вырасла ў лесе, яна ведае такое, пра што многія і не здагадаліся б.

Хіба гэта не найвялікшая радасць, калі алені пазнаюць яе, бяруць з яе рук буракі, дазваляюць гладзіць сябе па гарбатых насах? Якою ж мерай судзіць тых людзей, што без літасці і спагады страляюць у такую красу? І як гэта балюча і крыўдна, што адным з такіх драпежнікаў з'яўляецца родны бацька! Цяпер Ірка ведае, што, акрамя паэзіі, ёсць у жыцці і жорсткая проза, хцівасць, грубы разлік. Урок не прападзе марна...

Што ж аб'ядноўвае і збліжае ўсе апавяданні, што ўвайшлі ў кнігу? На маю думку, перш за ўсё падыход Івана Пташнікава да адлюстравання рэчаіснасці. Паэтычнае бачанне свету не ператварыла пісьменніка ў пасіўнага сузіральніка прыроды. Героі Пташнікава — людзі актыўныя ва ўсім, у тым ліку і ў дачыненні да прыроды. З'яўляючыся шукальнікамі, яны радуюцца ўсяму добраму, не праходзяць абыякава міма адмоўных з'яў.

Нават у самых паэтычных апавяданнях «Алёшка» і «Алені» заўважаюцца элементы бытапісальніцтва, якія надаюць гэтым творам яшчэ большую жыццёвасць, робяць іх асабліва пераканальнымі. Успомнім, да прыкладу, шматлікія дэталі, якія ўзнаўляюць быт толькі што вызваленай ад акупантаў вёскі, адкуль Алёшка нясе пісьмо на пошту. Прыгадаем таксама спрэчку за сталом, калі Ірка здагадваецца, што маці корміць сям'ю мясам забітага аленя. А цяпер возьмем самае, здаецца, бытапісальніцкае з усіх сямі апавяданняў — «Сцяпан Жыхар са Сцешыц». Хіба ж мала паэзіі ў гэтай празаічнай гісторыі пра чалавека, што адарваўся ад вёскі, але пакінуў там часцінку сваёй неспакойнай душы, якая не зусім яшчэ зачарсцвела і зноў ажывае, калі туды стукаецца любоў?

Нездарма апавяданне пачынаецца словамі: «Чалавек заўсёды смялейшы на тых сцежках, якія ён шмат таптаў...» На тых сцежках шафёр Сцяпан Жыхар забывае пра сваю заўсёдную браваду, не хоча думаць пра «левыя» рэйсы, пра капеечныя разлікі. Прыехаўшы на адведкі ў родную вёску, Сцяпан многае ўспомніў, на многае паглядзеў тымі ж вачыма, якія некалі захапляліся красою вернай каханкі. Зноў ён адчуў, як пахне з лесу яловай смалою і багуном, залюбаваўся белымі грудкамі кнігавак, здзівіўся, што за адну ноч бульбоўнік на гародзе стаў белы, нібыта найшло снегу. Белы цвет — «гэта паспешка, ён ведае. Ён капаў колькі вунь у гародзе. А тую, што дзіла сінім, маці заўсёды крычала, каб не падкопвалі...» Тады прыйшло і новае, нязнанае дагэтуль пачуццё: як жа ён, Сцяпан, дапусціў, каб яго сын пры жывым бацьку рос бязбацькавічам? Пачалося прасвятленне, якое перайначыць усё жыццё шафёра. Пісьменнік знайшоў словы, каб найлепш перадаць настрой свайго героя на самым пачатку яго адраджэння:

«Маё ты хлапчанё... мы з табой, брат, паедзем проста да мяне, на Сельгаспасёлак. Мы з табой, брат, пачнём жыць па-мужчынску. Я, брат, і шмат не п'ю, а то і зусім кіну. Я табе і тэлевізар куплю і рыбак... Ты, брат, мне сын. Ты сын мне. Вось так...»

Пры такой шырыні пісьменніцкага дыяпазону, пры такой разнастайнасці яго творчых інтарэсаў зусім не здзіўляешся, калі ў адным з апавяданняў раптам зайграе чыстым агнём яшчэ адна грань. Пры шліфоўцы дыяментаў гэта часта бывае. Мы сказалі «раптам». Але няма, відаць, нічога нечаканага ў тым, што ў апавяданні «Прахадная пешка» гэтай новай гранню стала вострая і злая сатыра на прыстасаванцаў і падхалімаў.

Добра, што пісьменнік умее і радавацца, глядзець на свет замілаванымі вачыма, і злаваць, калі ён сустракаецца са з'явамі, якія заслугоўваюць бескампраміснага асуджэння. Ахвотна верым, — і для гэтага ёсць усе падставы, — што Іван Пташнікаў пакажа нам яшчэ многа яркіх граней свайго пісьменніцкага таленту. Пра гэта сведчыць правільны кірунак яго творчых пошукаў.

І. Пташнікаў. «Сцяпан Жыхар са Сцешыц». Апавяданні. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

партызанскай палітыцы. Сын селяніна, аграном, я не забываўся пра гэтую палітыку ў самыя цяжкія хвіліны. Я ведаў, што ваяваць нам не адзін год. Не адну зіму сядзець у пушчы і думаць, дзе дастаць хлеб, патроны і жалезную бочку, з якой можна зрабіць печку замест той, што прагарэла. Каб ваяваць доўга, зацята, з такім бязлітасным ворагам, трэба захаваць людзей. Трэба накарміць іх і сагрэць. Цяпер я думаю: фашысцкія стратэгі разумнелі пасля таго, калі атрымлівалі добрага выспятка ў самае балючае месца. Ніхто з іх не здагадваўся, у што можа вырасці невялікі атрад «лясных бандытаў», пра які яны ведалі, пісалі ў рэляцыях. Каб такія блакады, як у сорак трэцім, яны наладзілі тады, зімой сорак першага, нам прыйшлося б туга.

У тыя дні я асабліва баяўся нямецкай атакі. Даходзіла да роспачы, якой я, аднак, не меў права нікому паказаць.

(Цішэй, Іване! Пра гэта нельга прызнавацца нават цяпер, праз дваццаць тры гады. Ды не, цяпер мне ўсё дазволена, я — пенсіянер).

Мы ведалі: ішла вялікая бітва за Маскву. Ад таго, як яна скончыцца, чыёй перамогай, вельмі многае залежыць. Хацелася памагчы сваім у гэтай бітве. Мы добра ведалі, якая дапамога найбольш эфектыўная. Эшалоны, што ішлі на фронт. Чым менш іх дойдзе, тым лягчэй будзе нашым.

Мы ўжо мелі невялікі вопыт. Але ў нас не хапала ўзрыўчаткі. Здабывалі яе па-рознаму. Адзін шлях быў самы пэўны, аднак самы небяспечны. Кіламетраў за дваццаць на былым нашым аэрадроме хлопцы выявілі склад авіябомб. Ад кожнай з гэтых бомб, як панура жартавалі партызаны, можна было загінуць шэсць разоў: на аэрадроме, у трох вёсках, праз якія трэба правезці смяротны груз і ў дзвюх з якіх размяшчаліся паліцэйскія гарнізоны, пры разборцы дэтанатара бомбы, пры выплаўцы толу і — я дадаваў сёмы выпадак — пры зборцы міны. Але гэтага сёмага ў атрадзе не прызнавалі, бо тут ужо справу мелі не з бомбай. Да таго ж, нам пашчасціла: у нас быў свой інжынер, ён канструяваў і рабіў міны. Пэўны час атрад трымаў манаполію на міны, мы нават вялі гандаль: у Каткова выменьвалі міны на хлеб і сала, у Касача — на коней, ён вывеў у лес конзавод.

Увосень, па бездарожжы, калі гарнізоны нельга было аб'ехаць — рэчкі, масты, — нам удалося разы тры правезці бомбы пад дрывамі, пад мукой з млына, а аднойчы — у вясельным картэжы, «жаніх» і «нявеста» сядзелі на бомбах. А тут, калі замерзлі рэчкі, выпаў снег, неглыбокі яшчэ, хлопцы засыпаліся. Везлі сена. Чаму нікому з нас не прыйшло ў галаву, што з часоў, калі з'явіўся тут першы чалавек, сена вазілі ў другі бок — з балот туды, у бязлесны раён, дзе знаходзіўся аэрадром, а не наадварот? Чаму я, камандзір, не падумаў пра гэта? А вы, мемуарысты, цяпер выхваляецеся, што ўсё ўмелі прадбачыць. Я не ўмеў.

Хлопцаў павесілі. На станцыі. Траіх. Чацвёрты — Федзя Кучык — паспеў шыбануць гранату, і яго распаласавалі аўтаматнай чаргой.

Пасля мне прыйшлося хаваць сотні людзей, сваіх, партызан, перажыць не адну няўдачу, блакады, голад. На прарыве з блакады вясной сорак трэцяга брыгада страціла амаль палавіну людзей. Гэта была найбольшая трагедыя. Я нёс цераз балота ўпаўнаважаную ЦК камсамола Галіну Берзнер, яе пасекла мінэй. Я плакаў... Ад болю, ад злосці, ад роспачы. Над ёй, над усімі тымі, хто застаўся там, каля Дняпра, на полі бою, хто патануў у балоце. Я не адразу ўбачыў, што нясу мёртвую. Мы штыкамі капалі ёй магілу на балотнай выспе... А смерць майго камісара Васі Шугановіча! А смерць братоў Валодзі і Пеці!..

Дзеці, дзеці, я хацеў бы ўсіх вас прыкрыць сваімі грудзьмі! Каб мог гэта зрабіць!

Але хіба толькі смерць Паўла я перажываў так цяжка, як смерць тых хлопцаў — Юркі Козела, Сашы Ляшкевіча і Кузьмы Валёнка. Каб яны загінулі, як Федзя — у баі, магчыма, гэта не раніла б так балюча. Але іх павесілі. Двое з іх прыйшлі ў лес разам са мной, у ліпені. Мы спалі ў адным будане, бо нас тады было ўсяго адзінаццаць.

Спачатку мяне адгаворвалі. Шугановіч, Будыка. Пасля сабралі партыйную групу і забаранілі. Напісалі пастанову: «Не дазволіць камандзіру атрада дарэмна рызыкаваць»... І ўсё адно я пайшоў. Паехаў на станцыю... Таксама ішоў снег. Не. Пачыналася завея. Вецер раскачваў іх целы. Хлопцаў павесілі на бэльцы згарэлага пакгаўза. Чорныя закапцелыя сцены, шырокі праём дзвярэй і ў іх — яны. Босыя, у адных споднім кашулях. Глядзелі мы здалёк, але я чуў, як стукаліся іх акасцянелыя ногі і звінелі, як струны, напятыя змерзлыя вяроўкі. І мусіў гандляваць салам. Яно не лішняе ў атрадзе, а я аддаваў яго фашыстам, тым, што павесілі маіх хлопцаў, маіх дзяцей. О, як мне хацелася дастаць з тайніка ў санях гранату і шпурнуць у іх. «Жонка», якая памагала гандляваць, наша атрадная гаспадыня, былая старшыня сельсавета Люба Рошча, шаптала: «Трымайся, камандзір. Сам палез. Цябе не пускалі». Адзін з варты паказаў на шыбеніцу і пагразіў: «Партызанен?» — і закруціў пятлю вакол шыі: маўляў, калі і ты партызан, то і цябе вось так. Трэба было ўсміхацца. Трэба было ўсміхацца! «О, не, пан, я стараста з Прыгар. Вось дакумент. Я — стараста». Хто з вас перажыў такі боль, такія пакуты, такі гнеў і бяссілле, як я за тую гадзіну, пакуль мы стаялі з санямі за сто крокаў ад павешаных!? Біць іх, біць, біць! Але як біць? Чым?

Вярталіся ў лагер. Разгулялася завіруха. Стагнаў бор — адзіны наш друг, наш абаронца. Стагнаў. Цяжка і яму. Лагер. Некалькі занесеных снегам зямлянак. Пуста — ні душы. Адзін застылы вартавы. З гэтай сілай мы хочам перамагчы тых, што праехалі ў эшалонах, пакуль мы стаялі на станцыі? Іх танкі, іх пушкі?

Загадаў Будыку:

«Уключы радыё».

«Садзяцца батарэі».

«Уключы. Паслухаем Берлін».

«На чорта табе Берлін?!» — але ўключыў.

«Што яны перадаюць?»

«Рэпартаж з фронту. Журналіст учора разглядаў у бінокль Крэмль».

Гэта было першае такое паведамленне, пачутае намі. Я ўскочыў.

«Брэшаш!»

«Не я брашу. Фашыст».

Ён, Валька Будыка, ваенны інжынер, танкіст, акружэнец, які драпаў пехатой з-пад Беластока, не паверыў. Ці, можа, зрабіў выгляд, што не верыць. А я паверыў. Упершыню паверыў фашысцкаму радыё. Не, яны не перадаюць для сваіх і на ўвесь свет, што ўзялі Маскву. Такія «уткі» яны пускалі толькі для нашых людзей месяц назад. А мы слухалі парад на Краснай плошчы, выступленне Сталіна і размнажалі лістоўкі, выкрывалі іх хлусню. Сваім яны разважліва, чуваць па голасу дыктара, паведамляюць, які выгляд мае Крэмль, калі глядзець на яго ў бінокль з адлегласці...

«Інжынер! Адкуль яны глядзяць? З якога месца? За колькі вёрст?»

«Ніадкуль яны не глядзяць! Брэшуць!»

«Не, глядзяць, Валя. Глядзяць! Ідзі папрасі ў Любы спірту».

«Не дасць яна мне».

«Для мяне. Для камандзіра».

«І для цябе не дасць. Чуў я, як яна з табой гаварыла. Распусціў ты іх тут. Развялі дэмакратыю. Ніякай дысцыпліны».

«Не! Хлусіш! Ёсць дысцыпліна! Найвышэйшая. Ты думаеш, хлопца не катавалі? Не круцілі рукі? Не палілі жалезам? Але каб хоць адзін выдаў атрад, згадзіўся правесці іх сюды, нам усім даўно была б хана. Для цябе дысцыпліна — уменне выцягнуцца, казырнуць. А для мяне яна — у вернасці, у стойкасці».

Не, наўрад ці сказаў я цалкам такія словы ў той вечар. Можа, гаварыў іх раней, напэўна — пазней, бо мы не аднойчы спрачаліся пра сутнасць партызанскай дысцыпліны. Не ведаю чаму, але з таго вечара я пачаў думаць пра смерць. Як я памру?

Была завіруха. А я ляжаў ці сядзеў у зямлянцы ў кампаніі маўклівага Шугановіча, які зусім не піў, і гаварлівага п'янаватага Будыкі і думаў усё пра тое ж: як я памру? Думкі пра смерць не палохалі, але волю скоўвалі. Без толу, без мін, з аднымі вінтоўкамі і двума кулямётамі, да якіх не так многа патронаў, — я не ведаў, што рабіць, як біць ворага, які ўжо разглядвае ў біноклі Маскву.

Памерці ў партызанах — тысяча выпадкаў. Я выбіраў самы цяжкі, такі, які мог бы прынесці найбольшую карысць атраду, маім таварышам, што пісалі: «Не дазволіць камандзіру атрада дарэмна рызыкаваць»... Не дазволіць... Хто можа дазволіць ці не дазволіць памерці?

Камісар сказаў:

«Людзі лічаць, камандзір, што ты многа п'еш».

Я ўскіпеў:

«Хто лічыць? Ты лічыш? Манах! Лясны схімнік! Кніжнік! Фарысей! Прэч з вачэй маіх!»

Ён не пакрыўдзіўся, мой добры ціхі Вася, завуч школы, паэт, які ў першую партызанскую вясну праседжваў над рэчкай і слухаў салаўёў.

Ён двойчы выратаваў мяне ад смерці: адзін раз ад немцаў, другі — ад сваіх, ад камандзіра спецатрада, які хацеў расстраляць мяне за тое, што я адмовіўся аддаць яму палавіну сваіх людзей. Ён не пакрыўдзіўся, Вася, не, але начаваць пайшоў у другую зямлянку, да партызан. Пакрыўдзіўся я. Не на яго. На сябе. Сварка з ім раптам неяк скіравала думкі ў другі бок.

Каб ведаць, што там робіцца пад Масквой! Каб ведаць пэўна! Безумоўна, нашы стаяць насмерць. Але памерці — не значыць перамагчы. Ці ёсць яшчэ каму станавіцца замест тых, хто навекі лажыцца ў снег?

Хацелася даведацца, што робіцца на фронце. Не з перадач радыё. Не з крыклівых нямецкіх рэпартажаў. Не са скупых зводак Саўінфармбюро. Я

ПІСЬМЕННІК І ГІСТОРЫК

Да 200-годдзя з дня нараджэння М. М. Карамзіна

Мікалай Міхайлавіч Карамзін займае віднае месца ў гісторыі рускай літаратуры. Карамзін быў таксама славутым гісторыкам. Яго «Гісторыя дзяржавы Расійскай», па словах Пушкіна, была «працай вялікага пісьменніка». Багаты фактычны матэрыял аб патрыятычных подзвігах рускіх людзей выкарыстоўвалі з гэтай «Гісторыі» Пушкін і дзекабрысты. Як гісторык і пісьменнік Мікалай Карамзін набыў агульна-еўрапейскую вядомасць.

У горадзе Сімбірску (цяпер Ульянаўск) прайшло дзяцінства і юнацтва пісьменніка. Потым ён вучыўся ў Маскве. Пасля смерці бацькі вярнуўся ў Сімбірск, дзе жыў да сярэдзіны васьмідзесятых гадоў васемнаццатага стагоддзя. Тут пачалася яго літаратурная дзейнасць.

Ульянаўск урачыста адзначыў 200-годдзе з дня нараджэння Карамзіна. У юбілейныя дні ў горадзе адбылося пасяджэнне вучонага савета абласнога краязнаўчага музея імя Ганчарова і навуковага савета абласнога архіва, прысвечанае памяці славутага пісьменніка і гісторыка. У Палацы кнігі імя У. І. Леніна, у бібліятэках вобласці адкрыліся кніжна-ілюстрацыйныя выстаўкі, адбыліся вечары чытачоў.

На радзіме пісьменніка, у вёсцы Карамзінка, будзе пабудавана памятная стэла.

АДН.

У ГОНАР БЕЛАРУСКАГА ПЕСНЯРА

На зямлі братняй Украіны любяць і шануюць творчую спадчыну Максіма Багдановіча.

У Львоўскім універсітэце імя Франка 9 снежня адбыўся вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта. Выкладчык універсітэта, літаратуразнаўца І. А. Дзенісюк расказаў пра творчы і жыццёвы шлях паэта. Малады беларускі паэт Сяргей Панізнік, які вучыцца ў Львове, гаварыў пра сувязь Багдановіча з украінскімі культурнымі традыцыямі. Львоўскія літаратары Раман Лубніўскі, Уладзімір Лучук і Іван Сварнік прачыталі свае новыя пераклады з Багдановіча.

Студэнты - беларусы, пачынаючая паэтэса Валянціна Коўтун, Рыгор Дружынін і іншыя, а таксама іх украінскія таварышы па вучобе чыталі творы М. Багдановіча, спявалі песні, напісаныя на словы паэта.

Ад імя Саюза пісьменнікаў БССР у вечары прынялі ўдзел Сцяпан Александровіч, Анатоль Вярцінскі і Мікола Хведаровіч.

СПАБОРНІЧАЮЦЬ МАЛАДЫЯ ДЫРЫЖОРЫ

У Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя Чайкоўскага праходзіць трэці тур Усесаюзнага конкурсу дырыжораў. У гэтым буйным спаборніцтве прымаюць ўдзел каля 50 маладых музыкантаў, якія прыехалі з розных гарадоў і рэспублік нашай краіны. Першы тур выявіў найбольш таленавітых і цікавых выпускнікоў буйнейшых музычных вну і рэспубліканскіх кансерваторый. Да другога туру па ўмовах конкурсу былі дапушчаны дванаццаць маладых музыкантаў з Масквы, Ленінграда, Прыбалтыкі, Казахстана, Карэльскай АССР і іншых рэспублік. Журы і аргкамітэт конкурсу, куды ўвайшлі буйнейшыя дырыжоры краіны, палічылі, што многія з удзельнікаў конкурсу вартыя выступаць у далейшым спаборніцтве, і звярнуліся з адпаведным хадайніцтвам у Міністэрства культуры СССР. Гэта просьба задаволена. Да ўдзелу ў другім туры былі дапушчаны дадаткова пяць чалавек, адзначаныя раней ганаровымі граматамі, у тым ліку прадстаўнік Беларусі Юрый Яфімаў.

Наш маскоўскі карэспандэнт сустрэўся з Юрыем Яфімавым. Мінчане добра ведаюць маладога дырыжора па яго выступленнях з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР і Дзяржаўным народным аркестрам. У Маскве яму давялося дырыжыраваць такімі вядомымі калектывамі, як Дзяржаўны сімфанічны аркестр СССР і Сімфанічны аркестр Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі. Выконваліся Другая сімфонія Брамса і Чацвёртая сімфонія Чайкоўскага.

— Конкурс стаў для мяне вялікай і карыснай школай,—сказаў Юрый Яфімаў. — Спаборніцтва многаму мяне навучыла як музыканта. З прыемнасцю слухаў я сваіх калег, многія з якіх сталі сапраўднымі майстрамі дырыжорскага мастацтва. Хацелася б, каб мы, малады дырыжоры, маглі перыядычна так сустракацца і надалей.

Пра маладога дырыжора з Беларусі з вялікай ухвалай адгукнуўся адказны сакратар журы конкурсу У. Каконін.

— Вельмі прыемна, — сказаў ён, — што на змену вядомым дырыжорам ідзе вартае іх папаўненне. Праз колькі дзён мы пачуем імёны шасці новых дырыжораў, якім будзе прысвоена высокае званне лаўрэатаў. Хочацца пажадаць нашым маладым сябрам далейшых поспехаў у іх творчай працы.

На здымку: дырыжор Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ю. Яфімаў, удзельнік Усесаюзнага конкурсу дырыжораў.

ГОСЦІ З СЕРБІІ

15 снежня ў Мінску пачынае гастролі Сербскі народны тэатр з горада Новы Сад. Гэта адзін са старэйшых тэатральных калектываў Югаславіі. Сёлета ён праводзіць свой 105-ы сезон.

У Новым Садзе штогод наладжваюцца тэатральныя фестывалі «Стэрыхіне пазор'е», якія з'яўляюцца своеасаблівым аглядам югаслаўскага тэатральнага мастацтва. На апошніх фестывалях тэатр атрымаў дзве прэміі за лепшую пастаноўку, тры прэміі за рэжысуру і прэміі за дэкарацыі і касцюмы. Акцёры ўзнагароджваліся восем разоў. Акрамя таго, прэміямі фестывалю адзначаліся п'есы «Нябесны атрад» Джорджа Лебавіча і Аляксандра Абранавіча і «Алілуя» Джорджа Лебавіча.

У Мінску сербскія артысты пакажуць інсцэніроўку па творах Радое Даманавіча «Страдзія» і драму Д. Лебавіча «Алілуя».

ЗНАХОДКА БІБЛІЁГРАФАЎ

Нядаўна ў фондзе рэдкіх кніг Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна ў адной з неапрацаваных кніг выпадкова знойдзены вельмі рэдкія цікавыя матэрыялы: газета «Мужыцкая праўда» і дзве лістоўкі выдатнага беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата Кастуся Каліноўскага.

Як вядома, Кастусь Каліноўскі і Валерый Урублеўскі ў 1862 г. стварылі ў Беластоку нелегальную друкарню, у якой друкавалі першую беларускую рэвалюцыйна - дэмакратычную газету «Мужыцкая праўда» і шэраг лістовак. Каліноўскі быў аўтарам і рэдактарам большасці артыкулаў.

Знойдзены трэці, шосты і сёмы нумары газеты «Мужыцкая праўда», два «Пісьмы ад Яські Гаспадара з-пад Вільні», дзве лістоўкі.

Я. АНЦІПАВА,
старшы бібліёграф фонду рэдкіх кніг.

ДА ТВАЙГО ЮБІЛЕЮ, СТАЛІЦА

Сівая веліч і маладая прыгажосць Мінска апета ў многіх творах пісьменнікаў і кампазітараў, мастакоў і скульптараў. У будучым годзе наша сталіца ўрачыста адзначыць сваё 900-годдзе. Да гэтай знамянальнай даты выдавецтва «Беларусь» выпускае некалькі кніг.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам загадчык рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва Алесь Бажко расказаў пра некаторыя з іх.

— Мы рыхтуем да выдання кнігу «Горад і гады»,—паведаміў ён. — У ёй чытач знойдзе вершы М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна, М. Аўрамчыка, апавяданні Я. Скрыгана, Р. Няхая, І. Навуменкі. З цікавымі ўспамінамі пра ўзнікненне беларускага тэатра выступае Яўген Раманові́ч, пра будаўніцтва ў Мінску пасля рэвалюцыі расказвае Раман Сабаленка. Аб працоўных буднях аўтазаводцаў і трактаразаводцаў раскажуць нарысы Тараса Хадкевіча і Алеся Асіпенкі. Уладзімір Карпаў прысвячае свой артыкул падпольшчыкам Мінска. Думаецца, з цікавасцю будзе прачытаны артыкул М. Аляксеева пра абарону нашай сталіцы ў грозныя дні лета 1941 года. Кніга будзе ілюстравана рэпрадукцыямі з лепшых карцін беларускіх мастакоў.

Юбілею Мінска прысвячае спецыяльныя выданні і рэдакцыя выяўленчай прадукцыі. Выйдзе з друку альбом «Паўстаўшы з руін» на беларускай, рускай і англійскай мовах. Аўтар тэсту і складальнік альбома Анатоль Вялюгін. У альбоме здымкі Ю. Іванова, А. і М. Ананьіных, В. Бараноўскага, Ул. Крука і іншых фотамайстроў. Неўзабаве выйдзе з друку і фотаальбом «Мінск» з тэкстамі Сяргея Грахоўскага.

Падрыхтавана да друку карта-схема Мінска, разлічаная на гасцей і турыстаў нашай сталіцы.

ВАЛОЖЫНСКІЯ ПАЯСЫ

Слуцкія паясы... Аб іх вядома за межамі Беларусі. Але ёсць паясы і ў Валожынскім раёне. Яны маюць свой узор, мясцовы каларыт. Наведайце вёску Узбалаць, і вам абавязкова пакажуць хату калгасніцы Веры Грыбоўскай, якая славіцца сваім майстэрствам вышыўкі паясоў.

Нядаўна ў Валожынскім раённым Доме культуры была арганізавана выстаўка выяўленчага і прыкладнога мастацтва. Актыўным удзельнікам яе стала Вера Грыбоўская. Каля 30 узораў паясоў прадставіла калгасніца на агляд. Самі іх назвы гавораць за сябе: «Кветачка», «Грабелька», «Вочка», «Ёлачка», «Крываножка», «Пруцік», «Жучок», «Бярозавы лісток», «Ланцужок».

Вялікае месца на выстаўцы занялі і каляровыя ручнікі, посцілкі, мастацкія вышыўкі, карункі, сурвэткі, рэпрадукцыі карцін, узоры разьбы па дрэву і інш.

П. БАРОДКА.

ТАДЖЫКІСТАН ВІТАЕ БЕЛАРУСЬ

У Таджыкістане пачаўся фестываль беларускіх кінафільмаў. З выпадку фестывалю ў сталіцу братняй рэспублікі — Душанбе выехала група творчых работнікаў кінастудыі «Беларусьфільм» і студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў на чале са старшынёй Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР Б. Паўлёнкам. 9 снежня пасланцоў Беларусі цёпла сустрэў шматтысячны калектыў Душанбінскага тэкстыльнага камбіната. Тэкстыльшчыкі прагледзелі толькі што закончаную на «Беларусьфільме» кінастужку «Я родам з дзяцінства». Апрача мастацкіх фільмаў, таджыкскія гледачы пазнаёмяцца з дакументальнымі кінастужкамі «Дарога без прывалу», «Вызваленне Беларусі».

ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ. Фотоэцюд **А. Глінскага.**

КАНЦЭРТ ДАЕ КЛАС

У зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбыўся канцэрт, у якім прагучалі фартэпіянныя п'есы беларускіх кампазітараў. Выконваліся творы М. Аладава, М. Бергера, В. Жубінскай, Д. Камінскага, Ул. Алоўнікава, П. Падкавырава і іншых аўтараў. Выканаўцамі былі студэнты класа прафесара М. Бергера.

Добрае ўражанне пакінулі аб сабе І. Бажок, Ж. Дубнікава, Н. Жога.

І. Бажок выканаў 12 прэлюдый П. Падкавырава проста, унутрана насычана. Ён раскрыў глыбокі лірызм і чалавечнасць, уласцівыя гэтым творам. Уражанне свежасці і прафесіяналізму засталося ад ігры Ж. Дубнікавай і Н. Жогі. Шмат добрага можна сказаць і пра В. Баннікава, Н. Каганоўскую, Б. Баленка, А. Сцепанцова, Л. Марозаву. Праўда, у іх выкананні часам адчувалася некаторая няўпэўненасць, але ідзе яна, бадай, ад недахопу канцэртнай практыкі.

Вельмі артыстычна выступіў А. Парэцкі. У яго ігры не было той дробязнасці і нервовасці, якая часам выдаецца за тонкасць. У А. Парэцкага чулыя пальцы, ён валодае мяккім тушэ, здольнасцю поліфанічна адчуваць усю тканіну твора. Праўда, часам на фортэпіяніст страчваў слыхавы кантроль, што прыводзіла да жорсткасці гучання. Але ўвогуле гэта не зніжала агульнага ўражання.

Нягледзячы на асобныя недахопы чыста выканаўчага характару, якія былі ў ігры амаль усіх выканаўцаў (цалкам натуральных для пачынаючых піяністаў), агульнае ўражанне ад канцэрта вельмі добрае. Ва ўсіх студэнтаў адчуваецца адна школа, усе добра валодаюць пальцавай тэхнікай, пачуццём рытму. Прыемна адзначыць, што ў класе вялікая ўвага аддаецца сучаснай музыцы, у прыватнасці беларускай. Канцэрт садзейнічаў прапагандзе беларускай фартэпіяннай музыкі сярод працоўных сталіцы.

А. БАГАТЫРОЎ,
прафесар.

ТЫЯ ДНІ Ў НАШЫМ ЛЕСЕ

[Заканчэнне. Пачатак на 2-й і 3-й стар.]

Што за чалавек? Я раскусваў людзей за адзін дзень, разбіраў іх па дэтальках і тут жа лёгка збіраў. Ты машына больш складаная, чым твае станкі. Кібернетычная. З вельмі складаным праграміраваннем—такім, да сэнсу якога могуць дайсці калі-небудзь хіба такія розумы, як мая Лада. А часам ты здаешся мне як «матрошка»—просценькі, але двайны ці трайны, і кожны па-свойму адмыслова закамуфляваны.

Разведчыкі не вярталіся тры дні. О, гэтыя тры дні! Я іх ніколі не забуду. Да смерці. Была завіруха. Сціхала. І зноў пачыналася.

Я сядзеў адзін. Шугановіч у зямлянку не заходзіў—жыў з партызанамі, займаўся справамі атрада. Я баяўся выйсці да людзей. Упершыню баяўся людзей. І каго? Тых, хто верыў мне, хто па сваёй волі станавіўся пад маё камандаванне, даручаў мне, па сутнасці, сваё жыццё, свой лёс. Але ж яны павінны і асудзіць мяне. Калі разведчыкі не вернуцца, я сам папрашу, каб мяне судзілі ўсім атрадам. Няхай расстраляюць перад строем. Не, такой смерці я не хацеў! Такой смерці не будзе!

Ніхто мяне не стане судзіць—гэта я ведаў. Але я асуджу сам сябе, калі не вернецца Павел, Будыка, стары будзёнавец Ермалай Краўчанка і хлопчык, сынок, дзетдомавец Толік. Яму ўсяго пятнаццаць.

Я баяўся нават папрасіць у Рошчыхі спірту. І яна, чортава душа, была добрая, калі не трэба. А то не з'яўлялася нават праверыць, як звычайна, ці цёпла ў камандзірскай зямлянцы. Было холадна. Цяпло любіў Будыка і паліў «самавар» бясконца.

Самае страшнае адзіноцтва, калі побач людзі, сябры, а ты адзін. Як вязень, як адшчапенец.

У прыёмнік быццам урывалася завіруха з усяго сямісоткіламетровага прастору, што ляжаў паміж нашым лесам і Масквой. Ледзь чутны — о, які далёкі! — матыў «Свяшчэннай вайны». Таму ён здаваўся жалобным. Бліжэй — нямецкае гаўканне. Але без Будыкі я не разумеў яго. Да д'ябла мне той «язык», калі яны ўжо ў Маскве! Сапраўды, навошта мне спатрэбіўся «язык»?

Шугановіч толькі на трэці дзень здагадаўся, у якім я стане. Мне хацелася даць яму ў морду, а потым пацалаваць. Залаты чалавек ты быў, Вася, але часам простыя ісціны да цябе даходзілі, як да жырафы,—на трэці дзень. Ён нават прынёс спірту і сам выпіў са мной.

«Ты разумееш, навошта мне «язык»?»

«Разумею. Але гэта ад страху».

«Выходзіць—я баязлівец?»

«Не. Але ў цябе—душэўная паніка. Ты не ведаеш, што рабіць. І таму кідаешся. То табе захацелася паглядзець на павешаных, то... А што твой «язык» скажа, няхай ён будзе хоць генерал?»

«Не, ты не разумееш! Я павінен убачыць хоць аднаго з іх—адтуль, з фронту. Якія яны цяпер?»

Разведчыкі здабылі-такі «языка». Але ўзялі не на той лясной станцыі, дзе павесілі хлопцаў, дзе была вадакачка і спыняліся для запраўкі цягнікі, а ажно ў горадзе, у нашым райцэнтры, за сорак кіламетраў. Абмарожаны слюнцяй, мабыць узрадаваны, што ад'ехаў так далёка ад фронту, вылез увечары ў завіруху з санітарнага эшалона, каб паспрабаваць купіць шнапсу. А Краўчанка сорак гадоў пражыў на адной з вулачак каля самай станцыі.

Ашалелы ад жаху, ад холаду, ад болю—разы тры за дарогу яму затыкалі рот, засоўвалі пад салому і тры чалавекі садзіліся на яго, як на куль,—фрыц не адразу загаварыў, хоць яго адагрэлі і накармілі. Потым раптам як сарваўся з ланцуга: крычаў фашысцкія лозунгі, пагражаў: «Сталін капут! Москаў капут! Алес капут!»

«Не, хлусіш, шчанюк! Гітлеру капут! Табе капут»,—сказаў я і выцягнуў з кабуры пісталет.

Ён упаў на калені. Сарваў з твару павязку. Замест носа—гнойны струп. Размазваў соплі і слёзы. Тыцкаў нам забінтаваныя пальцы і ўсё хацеў паказаць абмарожаны палавы член, не ўзіраючы на прысутнасць жанчыны—Рошчыхі. Відаць, думаў, што абмаражэнне такога далікатнага месца найбольш кране нас.

Люба плявалася.

Будыка смяяўся, ён быў вясёлы, як ніколі,—вярнуцца з такой аперацыі! Толькі ўваліўшыся ў зямлянку, сказаў:

«Не такі страшны чорт, як яго малююць».

Мне таксама хацелася смяяцца. Гледзячы на гэтага заваёўніка, на гэтага «пераможцу», я быццам адтаваў, быццам раптоўна і дзівосна вылечваўся ад цяжкай хваробы. Хоць нічога пра тое, галоўнае, пра што я так прагнуў даведацца, палонны не сказаў. Атупелы смаркач. Не помніў нават гарады, праз якія прайшоў. З пунктаў Падмаскоўя, знаёмых Будыку і мне (я вучыўся ў Міразеўцы), назваў адну Істру. Істра недалёка, але і не так блізка, каб вы маглі ўбачыць Маскву! Колькі кіламетраў да Масквы ад таго месца, дзе ён абмарозіўся? Не ведаў. Абяцалі яму маскоўскую цёплую кватэру? Раней, калі было яшчэ цёпла, абяцалі. Колькі забітых, раненых? Абмарожаных? Пасля аднаго бою тыдні два назад засталося ў страі менш палавіны салдат. А потым—завіруха, мароз. Ён абмарозіўся ў караўле. «О, гэта была страшная ноч!»

Дапытвалі доўга, увесь вечар. Дапытвалі з прыемнасцю. І павесяліліся пасля. Разгуляўся іншынер. Здаецца, той—адзіны выпадак, калі я добра разумеў Будыку, весялосць яго, узбуджанасць.

Раніцой Шугановіч спытаў, што рабіць з немцам.

«Пакажы яго партызанам. Узброеным. Пастаў перад строем. Пасля будзем судзіць. Назначаю трыбунал. Пяцёрку. Ты, я, Рошча, Краўчанка, дзед Міхайла».

У дзеда, які прыгнаў нам у лес рэшту калгасных коней, спалілі хату, закатавалі нявестку і ўнука.

Першая падала голас Люба Рошча. Самыя бязлітасныя мсціўцы—жанчыны, у гэтым я пераконваўся не аднойчы.

«Чаго тут доўга разводзіць анцімоніі! Расстраляць».

Панура сядзеў Краўчанка, звесіўшы свае сівыя будзёнаўскія вусы. Скура на твары, што ў старога слана, такая цвёрдая на выгляд і з такімі глыбокімі маршчынамі. Яго слова чакалі доўга.

«Палонны ёсць палонны. Але куды нам дзявацца яго?»

Вася Шугановіч, усхваляваны, расчырванелы, як бы спяшаўся адказаць на пытанне будзёнаўца:

«Сын аптэкара. Дробны буржуа. З такіх Гітлер набіраў свае штурмавыя атрады. Але гэты не стаў эсэсаўцам, гестапаўцам. Звычайны салдат. Можа паспрабаваць прасвятліць яму мазгі? Калі ўбачым, што фашыст, гад, тады ўжо...»

«Добранькі ты, камісар. Каб я карміла немчуру, воўка, які будзе ўвесь час глядзець у лес!..—абурылася Люба.—Што табе скажуць партызаны?»

Вася разгубіўся. Ён не гатовы быў выбіраць адно толькі з двух магчымых рашэнняў — расстраляць ці адпусціць.

Я ведаў з самага пачатку, што трэцяга рашэння няма. Але ці гатовы быў я сам выбіраць? Учора я расстраляў бы яго без размоў. Ад роспачы. Ад адчування свайго бяссілля перад іх магутнасцю,—яны, гады, разглядаюць у біноклі Маскву. Нарэшце, помсцячы за хлопцаў. Сёння ўсё змянілася. Я—камандзір, я ажыццяўляю Савецкую ўладу ў захопленым ворагам раёне. Ваенныя законы суровыя. Барацьба на смерць. Але і ў гэтых законах павінна быць увасоблена найвышэйшая мудрасць, гуманнасць і справядлівасць майго народа. У чым яна? У чым яна? Што табе скажуць партызаны? Можа, варта запытаць у атрада? Але дзе многа людзей—там часам бушуе стыхія. А тут трэба спакой і роздум.

«Міхайла Селівонавіч, тваё слова».

Уздыхнуў дзед.

«Адпусціць яго, дзеткі, з богам. Мы—не яны. Доктар кажа: пальцы яму трэба адразаць. Калека. Больш ваяваць не пойдзе».

Люба сказала:

«Ну, дзед, здзівіў ты мяне».

Я доўга не мог нічога сказаць. Слухаў, як адтавала ў сэрцы нешта, што застыла, замерла, зачарсцвела ў апошнія дні і што магло ператварыць сэрца ў камень. Дзякую табе, дзед. Ты — наша сумленне.

«Пішы, камісар. Трыбунал атрада «Смерць фашызму» пастанаўляе: радавога нямецкай арміі... як яго?.. узятага ў палон, адпусціць. Раненых не расстрэльваем!»

Я сам завёз яго на чыгунку. Развязаў вочы. Ідзі. Да станцыі кіламетраў дзесяць. Дойдзеш — тваё шчасце. У цябе, здаецца, пачынаецца гарачка. Магчыма, гангрэна. Ідзі, але не забывай, што смерць цябе чакае ўсюды на нашай зямлі! І другім пра гэта скажы!

Літаратура і Мастацтва 4

Аўторак, 13 снежня 1966 года.

Помнікі нашага краю

НА ВЫСОКІМ беразе Заходняй Дзвіны стаіць адзін з найбольш манументальных будынкаў старога Віцебска — былы палац губернатара. Дакладны час пабудовы палаца і імя аўтара яго нам невядомыя. Палац мог быць пабудаваны недзе ў канцы XVIII або ў самым пачатку XIX стагоддзяў.



БАКАВЫ ФАСАД ПАЛАЦА.

Будынак спраектаваны пад уплывам архітэктуры рускага класіцызму. Палац разам з пазнейшымі прыбудоўкамі ўтварае вялікі ўнутраны двор складанай канфігурацыі.

Асноўны трохпавярховы корпус арыентаваны на поўнач. Галоўны фасад упрыгожаны магутным порцікам, які складаецца з чатырох паўкалон. Корпус, што выходзіць на Заходнюю Дзвіну, двухпавярховы. Першы паверх мае вялікія прамавугольныя вокны. Вокны другога паверха арачнай формы, яны падзелены паміж сабою паўкалонамі. Флангі корпуса ажыўлены чатырохкалоннымі порцікамі.

За доўгі век свой палац не раз рамантаваўся і перабудоўваўся, і цяпер цяжка гаварыць пра яго першапачатковую ўнутраную планіроўку.

Галоўны, паўночны фасад палаца павернуты да невялікай прамавугольнай плошчы. Кампазіцыйным цэнтрам плошчы з'яўляецца цудоўны помнік-абеліск, пабудаваны ў гонар перамог рускіх войск у 1812 годзе (аўтар помніка — вядомы рускі архітэктар І. Фамін).

Шырокую вядомасць палац атрымаў не столькі з-за сваіх архітэктурных якасцей, колькі ў сувязі з гістарычнымі падзеямі.

Першай такой падзеяй была Айчынная вайна 1812 года. Наніроўваючыся на чале сваёй арміі на Маскву, Напалеон правёў у Віцебску два тыдні. Яго штаб-кватэрай стаў палац губернатара. На плошчы перад палацам штодзённа ў прысутнасці самога Напалеона адбываўся развод войск. Помнік у гонар перамогі над французскімі войскамі быў пабудаваны іменна на гэтай плошчы.

Палац нездарма называецца «губернатарскім», бо ён быў рэзідэнцыяй генерал-губернатараў і губернатараў. Цікава адзначыць, што ў Віцебску віцэ-губернатарам у 1853—1854 гадах служыў пісьменнік І. Лажэчнікаў.

З палацам звязаны і больш блізкія нам гістарычныя падзеі.

1 кастрычніка 1917 года ў палацы была праведзена першая губернская канферэнцыя Віцебскай арганізацыі РСДРП(б). У канцы таго ж месяца тут размясціўся Ваенна-рэвалюцыйны камітэт РСДРП(б) Віцебска, які абвясціў Савецкую ўладу ў горадзе і губерні.

У сярэдзіне чэрвеня 1919 года на чале агітацыйнага поезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» ў Віцебск прыязджаў М. І. Калінін. Усесаюзны староста выступіў з прамовай на пашыраным пасяджэнні Віцебскага губвыканкома, якое праходзіла ў палацы.

У час Вялікай Айчыннай вайны палац быў спалены. Адноўлены ён адразу ж пасля вайны.

І. ЭЛЕНТУХ,
старшы архітэктар па ахове помнікаў Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва.

ПАЭЗІЯ НАРОДНАЙ МОВЫ

Багаты, выразны, вялікі лексічны запас мовы казацтва Дона — легендарнага краю паэтычных паданняў і чароўных песень. Дзівосная вязь яркіх карунак народнай мовы назаўсёды ўплялася ў прыказкі, прымаўкі, частушкі, песні, быліны, казкі данскіх казакаў. Дыялектныя словы ўпрыгожваюць казацкую мову, робяць яе пластычнай, своеасаблівай.

У лексіцы Дона шырока адлюстраваліся складаная палітычная барацьба працоўнага народа з прыгнятальнікамі, яго эканоміка, геаграфія, быт, культура, жыццёвая філасофія. Мова данскіх казакаў мае шмат арыгінальных слоў, звязаных з вайсковай справай, сельскай гаспадаркай, рыбнай лоўляй, вінаградарствам і садоўніцтвам, рамяством, жывёлагадоўляй, здабычай вугалю, будаўніцтвам, этнаграфіяй і абрадамі.

За гады Савецкай улады на Доне адбыліся сур'ёзныя змены ў грамадскім укладзе казацтва, яго быце, умовах працы, культуры. І ў моўным ужытку з'явіліся сотні новых слоў.

Народныя гаворкі Дона маюць вялікую навуковую цікавасць для ўстанаўлення агульнага працэсу развіцця рускай мовы. Вывучэннем іх шмат гадоў займаюцца вучоныя лінгвістычных кафедраў шэрагу вну буйных гарадоў поўдня: Растова-на-Доне, Волгаграда, Шахтаў, Таганрога. У хутарах, станіцы, пасёлкі Дона і яго прытокаў выязджаюць спецыяльныя дыялекталагічныя экспедыцыі.

Летам гэтага года экспедыцыі кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства Растоўскага універсітэта разам з вучонымі іншых вну вобласці працягвалі вывучэнне народнай данской мовы, збіраючы новыя лексічныя матэрыялы на радзіме Міхаіла Шолахава, у Азоўскім, Канстанцінаўскім і іншых раёнах.

Вучоным актыўна дапамагае грамадскасць. За 15—20 апошніх год настаўнікі, бібліятэкары, журналісты, пісьменнікі, школьнікі, краязнаўцы, фальклярысты запісалі тысячы яркіх, трапных слоў.

Усе гэтыя багацці народнай мовы, спецыфічныя мясцовыя словы, якія адсутнічаюць у карэнным складзе сучаснай літаратурнай мовы, уключаны ў «Дыялекталагічны слоўнік рускіх гаворак Дона». На старонках слоўніка знайшлі месца лексіка-семантычныя дыялектызмы, невядомыя ў літаратурнай мове фразеалагічныя дыялектызмы (трывалыя спалучэнні слоў); словы, якія валодаюць толькі вядомай ступенню своеасаблівасці ў параўнанні са словамі літаратурнай мовы.

Створаны слоўнік на аснове жывой размоўнай гаворкі. У ім захаваюцца ўсе фанетычныя асаблівасці данскіх гаворак, іх сінтаксіс, марфалогія, лексіка і фразеалогія.

Картатэка слоўніка ўвабрала больш за 20 тысяч арыгінальных слоў. Дадзены тлумачэнні ўсіх данскіх дыялектаў, указаны іх слоўныя варыянты. Тлумачэнне кожнага слова ілюструюць прыклады з жывой народнай мовы, твораў пісьменнікаў і паэтаў. Жывыя прыклады дапоўнены словамі з архіўных матэрыялаў XVII—XIX стагоддзяў, з краязнаўчай літаратуры. Шмат яркіх прыкладаў узята з раманаў і апавяданняў Міхаіла Шолахава.

Работа над двухтомным слоўнікам рускіх данскіх гаворак закончана. Першы том скарбніцы данской казацкай мовы знаходзіцца ў выдавецтве Растоўскага універсітэта. Аб'яднаны аўтарскі калектыў навуковых работнікаў мовазнаўчых кафедраў пад кіраўніцтвам дацэнта В. С. Аўчыннікавай заканчвае рэдактарскую работу над апошнім томам капітальнай працы.

Павел КАВЕШНІКАЎ.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

13 снежня

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50—для школьнікаў. Канцэрт вучняў школ прафтэхадукацыі. Перадача з Казані. 17-20 — для дзяцей. «Пеця і воўк». Фільм-балет. 17-45 — для школьнікаў. «Расказвае Любазнайкін». Аб цікавым у тэхніцы. Перадача першая. 18-00 — тэлевізійныя навіны. 18-20 — для слухачоў пачатковай палітшколы. Біяграфія У. І. Леніна. «На першы штурм царызму». Перадача з Ленінграда. 19-00 — Г. Ібсен. «Доктар Стокман». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка першая. Перадача з Ленінграда. 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 20-50 — «Дружба». Сумесны савецка-чэхаславацкі часопіс (М). 21-20 — «Табе, юнацтва!» (М). 22-10 — «Лепшая песня года» (М).

У дапамогу завочнікам (для студэнтаў вну). 22-50 — «Начартальная геаметрыя». 23-20 — «Вышэйшая матэматыка».

Другая праграма. 11-00 — тэлевізійныя навіны (М). 11-10 — канцэрт (М). 17-20 — «Гутаркі ля раяля». І. Брамс. Трэцяя саната для скрыпкі і фартэпіяна (М). 18-00 — тэлевізійныя навіны (М). 18-20—«Насельніцтву пра грамадзянскую абарону». Навукова-папулярны фільм. 19-00 — «На пераправе». Кароткаметражны фільм. 19-30 — канцэрт. 21-30 — «Цяжкі шлях». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Узбекфільм».

14 снежня

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17-30 — для школьнікаў. «Расказвае Любазнайкін». Аб цікавым у тэхніцы. Перадача другая. 17-50 — для малых. «Брыдкае качаня». Мультфільм. 18-10 — тэлевізійныя навіны. 18-30 — першынство СССР па хакеі. «Спартак» — «Дынамо» (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 20-40 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — музычная праграма (М). 22-25 — «Беларусь — песня мая». Песні Ю. Семяняки.

У дапамогу завочнікам. (Для студэнтаў вну). 23-05 — «Начартальная геаметрыя». 23-35 — «Вышэйшая матэматыка».

Другая праграма. 17-30 — «Навука — вытворчасці». Тэлевізійны часопіс (М). 18-00 — «Панарама Радзімы» (М). 18-30 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Праз горы часу». «Вечнае святло». Кінанарысы. 19-20 — для юнацтва. «Народжаныя бурай». Сустрэча камсамольцаў трох пакаленняў з арганізатарамі першай камсамольскай групы г. Мінска. 20-00 — рэклама, аб'явы. 20-05 — «Парожні рэйс». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Ленфільм». 21-35 — «Месяц». Навукова-папулярны фільм. 22-25 — у эфіры «Маладосць», «Арбіта». Перадача з Кіева.

15 снежня

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50 — для школьнікаў. «Піянерыя». Кіначасопіс (М). 17-00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Расказы аб прыродзе». Перадача з Ленінграда. 17-30 — для школьнікаў. «Архіварыус». Тэлевізійны альманах. 18-15 — «Па музеях і выставачных залах». Рэпартаж з мастацкай выстаўкі (М). 18-40 — «Свет сёння» (М). 19-10 — Г. Ібсен. «Доктар Стокман». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка другая. Перадача з Ленінграда. 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — «Апошнія пісьмы». Дакументальны фільм. 21-30 — тэлевізійныя навіны. 21-40 — «Ева хоча спаць». Мастацкі фільм. Вытворчасць Лодзінскай кінастудыі. Польшча. 23-05—выдатныя творы сусветнай класікі. В. Моцарт. «Пражская сімфонія».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне выказвае спачуванне народнай артыстцы БССР А. В. Нікалаевай з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці маці.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі—3-22-04, аддзела культуры—3-22-04, аддзела інфарм